Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Ц[ентральнага] Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

154 кр. "Советская Белорусь"
Одесса, Пастера 13, государ-
ствен. публичн. библиотека.
студ. сынок. адзін экз.

КОШТ НУМАРУ 5 кап.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).
ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.
Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.
Невыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц — 90 к.; » 3 » — 2 р. 70 к.; » 6 » — 4 р. — к.; » 1 год — 8 р. — к. Зьмена адрасу: іншагароднія — 30 к., мясцовыя — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок нанпарэлі пасьля тэксту — р. 50 к. За радок нанпарэлі пасярод тэксту 1 р. — к. За радок нанпарэлі перад тэкстам 1 р. 50 к. Сьпешныя на 50 проц. даражэй. Звыш тарыфу бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 дакумант — 35 кап. За кожны дадатковы — 15 ». Беспрацоўн. і чырвонаармейцы за дакумант — 15 ». За кожны дадатковы — 5 ». Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, ва ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і ва ўсіх паштовых канторах.
АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

10 год выданьня — ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. — № 244 (2733) Чацьвер, 24-га кастрычніка 1929 г.

Восем чырвоных эшалёнаў бульбы рушым у першую пяціднёўку Маскве і Ленінграду

Калгасаўцы, савгасаўцы і рабочыя прамысловасьці распачалі арганізацыю 8 чырвоных эшалёнаў бульбы для чырвоных сталіц. Працоўныя БССР з энтузіязмам падтрымаюць гэтую ініцыятыву. Максымум энэргіі і плянавасьці з боку загатоўцаў. Ніводнай лішняй гадзіны прастою сялянскіх падвод у загатоўцаў і чыгуначнага складу на станцыях. Чыгуначнікі дапамогуць працоўным БССР у тэрмін даставіць бульбу пралетарыям Масквы і Ленінграду. Ударная задача загатоўкі бульбы будзе пасьпяхова выканана. Забясьпечым загатоўкі тарай; арганізуйце збор мяшкоў. Сурова і рашуча зьнішчым недахваты ў загатоўках бульбы.

Задача першай пяціднёўкі.

Ініцыятыва калгасьнікаў, савгасьнікаў і рабочых прамысловасьці БССР — загатоўцы бульбы для нашых буйнейшых рабочых асяродкаў Масквы і Ленінграду зараз дружна падхоплена працоўнымі масамі БССР. Ужо з месц паступаюць зьвесткі аб тым, што бядняцка-серадняцкія масы вёскі распачалі арганізацыю чырвоных абозаў для дастаўкі бульбы на станцыі, што асобныя вёскі ў парадку спаборніцтва вызначаюць першыя плянавыя наметкі.

Вырастае энтузіязм мас, які яскрава падкрэсьлівае клясавую салідарнасьць працоўных БССР з пралетарыятам чырвоных сталіц Савецкага Саюзу—Масквы і Ленінграду.

ЦК КП(б)Б і ўрад БССР, усямерна зацікаўлены ў тым, каб падтрымаць ініцыятыву калгасьнікаў, савгасьнікаў і рабочых прамысловасьці, каб падтрымаць той энтузіязм працоўных, які патрэбны для пасьпяховага правядзеньня кампаніі, сёньня зьнёсься з акругамі на прадмет унясеньня чоткасьці і плянавасьці ў загатоўчую працу.

За тэрмін з 25 да 29 кастрычніка намечана адправіць 8 эшалонаў. Вызначаны станцыі адпраўкі. Прызначаны ўпаўнаважаныя за сваячасовай пагрузкай і адпраўкай эшалёнаў.

Мясцовыя савецкія органы, партыйныя, прафсаюзныя, каапэрацыйныя і грамадзкія арганізацыі павінны ўлучыць максімум увагі і энэргіі правядзеньню кампаніі загатоўкі бульбы звыш плянавай асеньняй адгрузкі.

Трэба дабіцца максімальнай гібкасьці нашага загатавіцельнага апарату, катэгарычна не дапускаючы выпадкаў валакіты і бюракратызму пры прыёме бульбы, якія могуць перашкаджаць працы, адмоўна адбіваючыся як на настроях сялянства, так і на тэмпах выкананьня пляну.

Рэкордны тэмп загатовак і мабілізацыі шырокіх мас працоўных вакол кампаніі загатовак, вось чаго трэба дабівацца і чаго мы бязумоўна даб'емся ў кампаніі загатоўкі бульбы.

8 эшалёнаў бульбы ў Маскву і Ленінград

У мэтах больш плянавага выкананьня загатоўкі бульбы і для больш шчыльнай сувязі працоўных БССР з рабочымі Масквы і Ленінграду ў парыяд з 25 да 29 кастрычніка ў гэтыя гарады будзе адпраўлена 8 эшалёнаў бульбы.

Першы эшалён са станцыі Менск адпраўляе ў Маскву Белсельтрэст 25 кастрычніка, прычым бульба будзе грузіцца на трох станцыях. Рудзенск—15 вагонаў, Заслаўль—20 вагонаў і Фаніпаль—15 вагонаў.

Другі эшалён адпраўляе таксама Белсельтрэст са станцыі Слуцак ў Маскву 26 кастрычніка.

Трэці эшалён будзе зьмешаным і будзе адпраўлен са ст. Мінск у Ленінград 26 кастрычніка. У арганізацыі гэтага эшалёну прымуць удзел Белсельтрэст, Белдзяржсьпірт, Белкалгассаюз, Белкаапсаюз і Белпаляводсаюз. Гэтымі арганізацыямі будзе адпраўлена разам 50 вагонаў бульбы.

Чацьверты эшалён адпраўляе Белдзяржсьпірт 25 кастрычніка са станцыі Ворша ў Ленінград у колькасьці 50 вагонаў бульбы.

Пяты эшалён будзе таксама зьмешаным, ён будзе адпраўлен 28 кастрычніка са станцыі Барысаў у Ленінград. У арганізацыі пятага эшалёну прымуць удзел Белсельтрэст, Белкаапсаюз і Белпаляводсаюз.

Шосты і сёмы эшалёны па 50 вагонаў адпраўляе Белкалгассаюз не пазьней 29 кастрычніка па аднаму эшалёну ў Маскву і Ленінград.

Восьмы эшалён будзе адпраўлен таксама не пазьней 29 кастрычніка са станцыі Ворша па Ленінград. Гэты эшалён адпраўляе Белкаапсаюз і Белпаляводсаюз.

Для саправаджэньня трох эшалёнаў бульбы вылучаюцца делегацыі ў складзе 10 чалавек кожная. У дэлегацыю будзе ўваходзіць чатыры рабочых савгасаў, два селяніна, два рабочых харчавой прамысловасьці і два з рабочых брыгад, якія вылучае ЦСПСБ.

Прафсаюзныя арганізацыі Менску, Барысаву, Бабруйску і Воршы вылучылі рабочыя брыгады для аказаньня дапамогі ў арганізацыі эшалёнаў бульбы. Рабочыя брыгады ўжо выехалі на месцы. Весткі з месц сьведчаць, што эшалёны з бульбай пойдуць у вызначаныя тэрміны. Чыгуначнай адміністрацыі трэба прыняць усе меры, каб вагоны пад бульбу падаваліся сваечасова, а нашы загатоўчыя арганізацыі павінны справу пагрузкі бульбы паставіць так, каб ня было прастояў вагонаў.

Па руках за дэзарганізацыю бульбянога рынку.

Акцыянэрнае таварыства «Продуктпереработка» вядзе ў БССР загатоўку бульбы, але як вядзе, мы і думаем крыху падзяліцца з чытачом.

Як дзе, а ў Рудзенску праца ў „Продуктпереработка" пастаўлена нішто сабе, вытрымана. Папершае, агэнтура падабрана таксама ў большасьці ўсё вытрыманая былыя—спэкулянты, або гандляры. Чалавек 15 з агэнтуры працуе на процантах.

Езьдзяць гэтыя агэнты па вёсках, ну і агітуюць: вы „мой", таварышы-сяляне, вязеце бульбу да нас, у нас не каапэрацыя—заплацяць даражэй. Ня толькі выяжджаюць на вёскі, але свае „заставы" выстаўляюць на дарогах і ловяць сялянскія падводы з бульбай за лейцы.

На глебе такой пастаноўкі загатоўчай працы часта можна назіраць малюнкі, як агэнт „Продуктпереработки" цягне селяніна да сябе, а прадстаўнік каапэрацыі—да сябе. Які ўплыў на сялян робяць гэткія мэтады загатоўчай працы, залішне гаварыць.

Адносна платы даражэй, чым у каапэрацыі, дык так яно і ёсьць на справе. Агентура „Продуктпереработки" плаціць сялянам за пуд бульбы замест устаноўленых 48 пяцьдзесят капеек. Часта не даплачваюць 1-2 руб., даюць авансы, каб селянін яшчэ прывёз ім бульбу.

Цікава адзначыць, што агэнтам дапамагаюць і іх сваякі, абы толькі выгнаць болей процантаў. У пагоні за процантамі справа дайшла да таго, што бульбяны рынак дэзарганізаваны.

Каб ня быць галаслоўным, дазвольце прывесьці пару вытрымак з актаў ад 13 кастрычніка.

„Агэнты" „Продуктпереработка" нераманьваюць да сябе сялян, абяцаюць ім цану даражэй, чым існуе ў каапэрацыі, што дэзарганізуе рынак"...

Чытайце далей.

„Рудзенская спажывецкая каапэрацыя выстаўляе на дарогах агэнтаў, якія заманьваюць да сябе сялян з бульбай. Высьветлілася, што гэта рэбіцца таму, што прадстаўнікі „Продуктпереработки" увесь час накіроўвалі сваіх агэнтаў на дарогі для затрымкі сялянскіх падвод з бульбай"...

Што не кажаце, а такіх загатоўшчыкаў добра было-б „пачаставаць" бульбай, але мы думаем, што гэтай справай займецца пракуратура і дасьць па руках за дэзарганізацыю рынку.

В. Паўночны.

Патрэбна тара для хлебазагатовак.

Шырокае разгортваньне хлебазагатовак і іншых сельска-гаспадарчых прадуктаў сустракае на сваім шляху шэраг перашкод. Адною з такіх перашкод зьяўляецца недахват мяшкоў. Мы маем шэраг вестак з акруг, якія кажуць аб недастачы мяшкоў. Зразумела, спадзявацца на тое, што мы можам у патрэбнай колькасьці атрымаць новыя мяшкі—нельга. Вось чаму мы павінны скарыстаць усе магчымасьці, каб атрымаць мяшкі на месцы.

Пытаньнем збору мяшкоў трэба заняцца ва ўсіх акругах. Некаторыя акругі, як напрыклад, Віцебская і Гомельская ўжо распачалі працу ў гэтым напрамку і нават арганізуюць спэцыяльны двухтыднёвік па збору тары. Гэты добры пачатак Віцебшчыны трэба перанесьці і ў іншыя акругі БССР.

Загатоўчым арганізацыям, на якія ўскладаецца ў першую чаргу задача па збору тары, неабходна дапамагчы. Вялікую дапамогу ў справе збору мяшкоў могуць аказаць: камсамольцы, дэлегаткі жанаддзелаў, школьнікі, актывісты і актывісткі сяляне на вёсцы.

Усе гаспадарчыя і каапэрацыйныя арганізацыі павінны тэрмінова праверыць наяўнасьць тары ў сябе, каб усю лішнюю тару тэрмінова перадаць хлебазагатоўчым арганізацыям.

Прафэсыянальныя арганізацыі, эканомкамісіі і экапом нарады павінны таксама тэрмінова правесьці праверку тары—мяшкоў і здаць іх адпаведным арганізацыям.

Пры належнай увазе пытаньню збору мяшкоў мы іх будзем мець і гэтым самым дапаможам пасьпяховаму ходу хлебазагатовак.

На барацьбу з фашызмам і сацыял-дэмакратыяй.

Маніфэст ЦК КПФ да працоўных Францыі.

ПАРЫЖ, 22-Х. ЦК КП Францыі выпусьціў маніфэст «да працоўных Францыі» наконт новай хвалі ўрадавых рэпрэсій супроць рэвалюцыйных арганізацый. Маніфэст заклікае „да мацнейшай барацьбы з фашысцкім урадам, яго сацыялістычнымі саюзьнікамі, да абароны адзінай рабочай партыі, газэты прафарганізацыі, да разгортваньня барацьбы на прадпрыёмствах, у рабочых кватэрах, кварталах, мілітарных прафсэкцыях, да заснаваньня на прадпрыёмствах новых «груп абароны» «Юманітэ», да павялічэньня сеткі рабкораў, да стварэньня новых фабрычна-заводзкіх газэт, да масавай лукі на мітынгі пралетарскіх арганізацый, да дэманстрацыі ля брамы фабрыкі, да падрыхтоўкі сьвяткаваньня 12-х угодак Кастрычніка.

Партыя абвяшчае баявую трывогу, кліча да абароны Савецкага Саюзу, да барацьбы за КП Францыі ва яе газэту, да барацьбы за патрабаваньні французскай рабочай клясы і яе вызваленьне".

Перамога кампартыі на муніцыпальных выбарах у Парыжы.

ПАРЫЖ, 21-Х. На муніцыпальных выбарах у 13 акрузе ў Парыжы камуністычны кандыдат Андрэ Марты атрымаў 4295 галасоў у той час, як радыкал Авіньён сабраў толькі 1162 галасы, незалежны сацыяліст Кузак—1157 галасоў, а сацыяліст Біду—759.

Гэты вынік выбараў набывае асаблівае значэньне ў момант, калі ўрад французскай рэспублікі суровымі рэпрэсіямі праследуе камуністычную партыю. Абраньне Марты муніцыпальным дарадчыкам зьяўляецца бляскучай перамогай камуністаў і, разам з тым, вострым паражэньнем натхніцеляў новага крыжовага паходу супроць камунізму ў Францыі.

Пакідаюць сацыял-дэмакратаў і ўступаюць у кампартыю.

ВЕНА, 22-Х. Група рэвалюцыйных сацыял-дэмакратаў «Палітышэ Арбайтэр Гезэльшафт», якая заснавалася пасьля ліпнёўскіх падзей 1927 году і выдае ўласны орган «Лінкер Сацыял-Дэмакрат», пастанавіла ўчора калектыўна ўступіць у аўстрыйскую кампартыю.

Газэта групы піша: „Мы ня хочам удзельнічаць у клясавым здрадніцтве сацыял-дэмакратаў з сёньняшняга дню і будзем змагацца як сябры кампартыі за канстытуцыю саветаў і за дыктатуру пралетарыяту. Для сумленных рабочых і рэвалюцыянэраў няма месца ў сацыял-дэмакратычнай партыі".

Рабочая моладзь парывае з сацфашыстамі.

ПАРЫЖ, 20-Х. У Лілі адбываўся мітынг моладзі, скліканы сацыялістычнай партыяй. У адказ на антыбальшавіцкую прамову сацыялістычнага дэпутата Саленгра (мэра Лілю) выступіў рабочы-камсамолец, які выкрыў сацыял-фашысцкае перараджэньне французскіх сацыялістаў. Тады група сацыялістычнай моладзі правакавала сутычку ў залі, а потым і на вуліцы. З боку сацыялістычнай моладзі ў сварцы ўзяла ўдзел паліцыя, выкліканая на дапамогу сацыялістамі. Камсамольцы вышлі з мітынгу згуртаванай дэманстрацыяй з выгукамі „прэч сацыял-шпікоў", „няхай жывуць саветы", няхай жыве Марты".

У Францыі арганізуецца падарожжа рабочай дэлегацыі ў СССР.

ПАРЫЖ. „Таварыства прыяцеляў СССР" у Францыі арганізуе падарожжа рабочай дэлегацыі ў СССР для ўдзелу ў Кастрычнікавых урачыстасьцях. Таварыства зварочваецца да рабочых самых буйных прадпрыёмстваў вайковай прамысловасьці—хімікаў, гарнякоў, докераў, транспартнікаў і іншых з заклікам падрыхтавацца да выбараў дэлегатаў. Агульны лік дэлегатаў не павінен перавысіць 100 чалавек, прычым у дэлегацыю павінна ўвайсьці каля 20 жанчын. Дэлегацыя прабудзе на тэрыторыі СССР 2 тыдні.

СТАН ЗДАРОЎЯ ТАВ. ЧЫЧЭРЫНА.

(Паведамленьне рэдакцыі „Известий")

МАСКВА, 22-Х. У сувязі з запытаньнямі, якія прысылаюцца ў рэдакцыю „Известий" наконт стану здароўя т. Чычэрына, рэдакцыя агалашае наступнае:

Тав. Чычэрын занядужаў у 1925 годзе дыябэтам (цукровай хваробай). Не зважаючы на цяжкую хворасьць, т. Чычэрын прадаўжаў сваю надзвычайна цяжкую і напружаную дзейнасьць. Да гэтага далучылася некалькі інфэкцый, перанесеных за апошніх 3 гады (цяжкая раматусовая інфэкцыя, ангіна і грып, які перайшоў у запаленьне лёгкіх).

У выніку ўсяго гэтага ўвосень 1928 году выбухнула новае аслажненьне—палінэўрыт (множнае запаленьне нэрваў), які прымусіў хворага легчы на 3 тыдні ў крамлёўскую бальніцу і выехаць потым для зацяжнага лячэньня ў Нямеччыну, дзе ён лячыўся спачатку ў Бэрліне пад наглядам выдатных прафэсароў, а потым і Вісбадэне. Водлуг аднагалоснага заключэньня ўрачоў, дасягнутае доўгім лячэньнем палепшаньне стану здароўя не нагэтулькі яшчэ значнае, каб можна было ўжо ў сучасны момант выехаць з Вісбадэну назад у Маскву. Пры далейшым палепшаньні стану здароўя тав. Чычэрына будзе ўзьнята пытаньне аб звароце яго ў СССР.

НОВЫЯ ПРАВАКАЦЫЙНЫЯ НАПАДЫ.

Белагвардзейскія шайкі і кітайскія белабандыты атрымалі дружны адпор з боку чырвоных пагранічнікаў.

ЧЫТА, 22-Х. За апошні час удоўж нашай мяжы пачалі лятаць кітайскія самалёты сыстэмы „Брэгэ" і „Потэс". Водлуг правераных даных, кітайцы за апошні час у г. Манчжурыя перакінулі 12 самалётаў. Адначасна кітайскія салдаты прадаўжаюць штодзённа і сыстэматычна абстрэльваць нашых пагранічнікаў і мірных жыхароў у раёне разьезду 86 і пасёлку Абагатуеўскага. Абстрэлы спыняюцца кожны раз толькі пасьля нашага агню ў адказ на іх страляніну.

* * *

ХАБАРАЎСК, 22-Х. Белая банда, якая перайшла на нашу тэрыторыю ў раёне Ханке, была золўлена нашымі часьцямі 20-га кастрычніка ў раёне Клёнаўкі (60 кілёмэтраў на паўднёвы захад ад Спаскай) і поўнасьцю зьнішчана.

* * *

УЛАДЫВАСТОК, 22-Х. Ноччу перад 22 кастрычніка кітайскае войска ў раёне станцыі Пагранічнай раптам па трывожнаму сыгналу распачало страляніну па нашых пагранічніках з вінтовак і кулямётаў. У выніку нашай адстрэлкі кітайскія салдаты спынілі агонь.

* * *

ЧЫТА, 22-Х. Некалькі дзён назад у раёне Трохрэчча з боку двух белагвардзейскіх атрадаў былі зроблены спробы перайсьці мяжу. Белагвардзейскія атрады зьнішчаны.

* * *

ШАНХАЙ, 21-Х. Агенцтва Гомінь паведамляе, што становішча на савецка-манчжурскай мяжы ня мае значных зьмен. Манчжурская ўлада ўжывае падрыхтоўчыя захады да зімоўкі свайго войска.

Арыштаваны служачыя Дальбанку Луканін і Альпаровіч.

ТОКІЁ, 19-Х. Харбінская паліцыя апячатала памяшканьне Дальбанку і арыштавала служачых Дальбанку Луканіна і Альпаровіча.

100 тыс. р. на дапамогу савецкім грамадзянам у Кітаі

МАСКВА. У сувязі з няспыннымі праследваньнямі і новымі рэпрэсіямі супроць савецкіх грамадзян у Кітаі, Саюзны ўрад, у дадатак да сродкаў, асыгнаваных раней на дапамогу савецкім грамадзянам, асыгнаваў яшчэ 100 тысяч рублёў, якія пераводзяцца ў Харбін пад загад накецкага генэральнага консула Штобэ.

* * *

ТОКІЁ, 17-Х. 14-га кастрычніка ў Сумбэйскім лягеры распачалася ўсеагульная галадоўка зьняволеных.

Мірныя настроі Ен-Сі-Шана.

ШАНХАЙ, 21-Х. Водлуг вестак Рэйтэра, Ен-Сі-Шан вярнуўся ў Вутай (правінцыя Шансі) і аднавіў перамовы з Фынь-Юй-Сянам. Ен-Сі-Шан спрабуе ўгаварыць Фынь-Юй-Сяна аддаць загад сваім прыхільнікам аб спыненьні ваенных апэрацый і чакаць мірнай згоды з Чан-Кай-Шы.

Новыя спробы рэфармістаў парушыць фронт гарнякоў.

Рэвалюцыйныя рабочыя выкрываюць здрадніцтва рэфармісцкіх мерапрыёмстваў.

ПАРЫЖ, 22-Х. Рэфармісцкія правадыры, імкнучыся адцягнуць гарнякоў вугольнага басэйну Байнаж (Бэльгія) ад барацьбы за заработак, назначылі на 24-га кастрычніка аднадзённую забастоўку пад лёзунгамі ўвядзеньня розных водпускаў і павялічэньня пэнсіі старым гарняком. Рэвалюцыйная арганізацыя гарнякоў—саюз „рыцараў працы" разам з камітэтам канфэрэнцыі рудніковых дэлегатаў у Шарлеруа выдалі адозву, у якой заклікаюць гарнякоў Бэльгіі сарваць рэфармісцкі манэўр і абярнуць назначаную на 24-га кастрычніка забастоўку ў баявое выступленьне за гарняцкія патрабаваньні. Адозва заклікае змагацца супроць капіталістычнай рацыяналізацыі, цьвёрда стаць на абарону рабочай бацькаўшчыны—СССР. Аргбюро бэльгійскай кампартыі ў адозьве да рабочых вітае рэвалюцыйныя пастановы дэлегацкай канфэрэнцыі ў Шарлеруа.

Бастуюць 5-ы тыдзень

ВЕНА. Згодна паведамленьня з Вэнгрыі, стачка гарнякоў у Фунскірхене прадаўжаецца ўжо 5-ты тыдзень. Бастуючыя патрабуюць павялічэньня заработку.

Гарнякі патрабуюць павялічэньня зарплаты.

ВАРШАВА, 18-Х. Прафсаюз гарнякоў зьвярнуўся да прадстаўнікоў горнай прамысловасьці Дамброўскага раёну з патрабаваньнем павялічыць заработак на 20 процантаў. Уласьнікі капальняў адказалі на гэта згодаю павялічыць заработак на 3 проц. Перамовы перарваны. Прафсаюз пагражае забастоўкаю. Аднаачасова канфлікты ў Дамброўскім і Сілескім вугольных раёнах ставяць польскую вугольную прамысловасьць перад небясьпекаю сур'ёзнага крызісу.

Жудасная рэакцыя супроць гарнякоў у Румыніі.

ВЕНА. Як паведамляюць з Румыніі, пасьля крывавага прыдушэньня жніўні выступленьня ў Люпэнах, праўленьне капальняў распачало рацыяналізацыю прадпрыёмстваў за кошт нашчаднай эксплёатацыі рабочых.

У сувязі з увядзеньнем больш танных спосабаў падрыўных работ, за апошніх 2 тыдні здарылася ня менш 15 няшчасных выпадкаў. Наступова звальняюцца гарнякі, якія бралі ўдзел у барацьбе за заработак. Урадавы тэрор у даліне Жыляўвы прадаўжаецца. Учыняюцца вобыскі, сходы забаронены. Сем'і рабочых, забітых у часе бойкі ў Люпэнах, церпяць праследваньне. Узброеныя фашысцкія банды пагрозаю звальненьня з працы, імкнуцца вырваць у рабочых згоду на ўступленьне ў жоўтыя прафсаюзы.

Урачыстая сустрэча „Страны Советов"

НЬЮ-ЁРК, 22-Х. Учора ў ратушы Сан-Францыска адбылося ўрачыстае ўшанаваньне экіпажу „Страна Советов". Мэр Сан-Францыска заявіў у сваёй прамове, што прылёт савецкага самалёту ў Злучаныя Штаты будзе спрыяць аднаўленьню прыяцельскіх зносін між абедзьвюма дзяржавамі.

24-хгадзінная забастоўка партавых докераў.

ПАРЫЖ, 20-Х. ЦК унітарнага прафсаюзу партовых рабочых ухваліў правесьці ва ўсіх партох 24-хгадзінную забастоўку докераў у знак салідарнасьці з бастуючымі трэці месяц докерамі.

Вынікі працэсу гастонскіх тэкстыльшчыкаў.

НЬЮ-ЁРК, 21-Х. Працэс гастонскіх тэкстыльшчыкаў скончыўся. Усе 7 абвінавачаных прызнаны вінаватымі. Згодна пастановы судзьдзі, Біль, Мільлер, Картэр і Гарысон засуджаны да астрогу на 20 гадоў; Мак Гвініс і Мак Лёфлін—на 15 гадоў, Гэндрыкс—на 7 гадоў. Усе засуджаныя выпушчаны на парукі да разгляду справы ў апэляцыйным судзе.

Брыян у адстаўцы.

ПАРЫЖ, 22-Х. Гавас паведамляе: „Палата дэпутатаў большасьцю 288 галасоў супроць 277 выказала недавер'е габінэту Брыяна".

БЭРЛІН, 23-Х. Падзеньне габінэту Брыяна зьявілася для палітычных колаў Нямеччыны нечаканасьцю. Правыя колы лічаць, што Брыян зрабіўся ахвяраю сваёй двухсэнснай замежнай палітыкі.

У Саюзе ССР.

Упаўнаважаны пасол Аўганістану ў СССР аб апошніх падзеях у Аўганістане.

МАСКВА, 22-Х. Надзвычайны ўпаўнаважаны пасол Аўганістану ў СССР пан Гулям Набі-хан, які вярнуўся ў Маскву пасьля кароткага пабыту ў Бэрліне, прыняў супрацоўніка ТАСС, у гутарцы з якім заявіў аб апошніх падзеях у Аўганістане наступнае: „Абраньне Надыр-хана падышахам Аўганістану сьведчыць перш-на-перш аб сканчэньні 11-ці месячнай грамадзянскай вайны, якая выклікала за сабою вялічэзныя зруйнаваньні і шмат ахвяр людзьмі.

Надзвычайная папулярнасьць Надыр-хана сярод аўганскіх пляменьняў і яго арганізацыйныя здольнасьці ў кіраваньні краінай зьяўляюцца лепшай гарантыяй устойлівасьці яго становішча і пасьпяховасьці яго палітыкі цэнтралізацыі, захаваньня незалежнасьці і ажыцьцяўленьня ўсіх неабходных рэформ. Надыр-хан належыць да ўмеранага крыла аўганскіх прагрэсістаў і зьяўляецца верным прыхільнікам аўганскай незалежнасьці. Гэта значыць, што замежная палітыка новага аўганскага ўраду будзе, як і пры ранейшым урадзе Аманулы-хана, усімі сіламі імкнуцца да захаваньня самых прыяцельскіх адносін з усімі дзяржавамі.

Што-ж датычыць унутранай палітыкі, дык яна застанецца прагрэсіўнай і рэфарматарскай у асноўных пытаньнях сацыяльнага жыцьця Аўганістану з вучотам, зразумела, усіх момантаў папярэдняй барацьбы і сучасных варункаў.

Пералом у хлебазагатоўках.

ЛЕНІНГРАД, 18-Х. У ходзе хлебазагатовак па вобласьці здарыўся пералом. Загатоўка хлеба павялічылася на 30-40 проц. ў параўнаньні з першай пяціднёўкай кастрычніка. Шырока разгарнулася датэрміновая здача хлеба.

Пераход на бесперапынны тыдзень

МАСКВА, 21-Х. Камісія НК Працы СССР абсьледвала шэраг фабрычна-заводзкіх прадпрыёмстваў і пабудоў, якія перайшлі на бесперапынны працоўны тыдзень. Перад пераводам на бесперапынку на большасьці прадпрыёмстваў была праведзена вялікая растлумачальная праца. У выніку рабочыя з самага пачатку адобрылі новы парадак працы.

Перавод на бесперапынку адразу-ж даў станоўчыя вынікі. Лік рабочых на прадпрыёмствах павялічыўся ад 8 з паловаю да 25 проц. Значна скарацілася звыштэрміновая праца. Выпуск прадукцыі павялічыўся: на фабрыцы імя Сьвярдлова—на 15 процантаў, на Дзяржмасллазаводзе—на 13 проц., на Чарамушынскім цагляным заводзе—на 6 проц. і г. д. На пабудовах бесперапынка паскорыла тэмп працы. Павялічылася прадукцыйнасьць працы рабочых. Толькі ў першы час нядзельныя дні давалі павялічаную колькасьць прагулаў па прычынах не заслугоўваючых увагі.

Распачаць падрыхтоўку да перавыбараў саветаў.

МАСКВА. Народны Камісарыят унутраных спраў прапануе адміністрацыйным кіраўніцтвам і камунальным органам распачаць падрыхтоўку да надыходзячай кампаніі перавыбараў саветаў. Адміністрацыйныя кіраўніцтвы павінны асаблівую ўвагу зьвярнуць на вучот пазбаўленцаў і прыцягнуць да распрацоўкі пытаньня аб правядзеньні гэтага вучоту савецкую грамадзкасьць.

Зацьверджан плян вылучэньня рабочых на адказную працу.

МАСКВА, 20-10. УсеЦСПС зацьвердзіў плян вылучэньня рабочых у савецкі, гаспадарчы і каапэрацыйны апарат. На працягу бліжэйшага году будзе высунута на савецкую, гаспадарчую, каапэрацыйную і калгасную працу 10 тысяч рабочых і 5 тысяч працаўнікоў. Апроч таго, 5 тысяч кваліфікаваных рабочых будзе падрыхтавана для паступленьня ў ВТНУ і гэтулькі-ж рабочых накіравана на працу ў прафарганізацыях. У прафарганізацыі будзе таксама высунута на настаянную працу 5 тысяч камсамольцаў.

Намёк Макданальда аб адстаўцы.

ЛЁНДАН, 18-Х. У палітычных колах выклікае розныя абмеркаваньні намёк Макданальда на магчымасьць яго адстаўкі, зроблены ім у прамове ў Канадзе. Дакладныя словы Макданальда такія: „Вельмі магчыма, што я адыду ад грамадзкага жыцьця ў той момант, калі я знайду гэта для сябе ёмкім".

Добра асьвядомленыя асобы не надаюць вялікага значэньня гэтай заяве, зазначаючы на тое, што Макданальд робіць падобныя намёкі ўжо не ўпяршыню, хоць да гэтага часу ён іх рабіў не ў такой пэўнай форме.

Манэўры японскай арміі і флёту

ТОКІЁ, 22-Х. 21 кастрычніка на ўзьбярэжжа Японіі распачаліся вялікія камбінаваныя манэўры японскай арміі і флёту. Манэўры разьлічаны на 10 дзён і ў іх удзельнічае 160 вымпелаў, 30 тысяч войска са складу Хірасійскай і Курумскай і 200 самалётаў.

Паліцэйскі налёт на памяшканьне кампартыі.

НЬЮ-ЁРК, 18-Х. У Чыкага паліцыя ўчыніла налёт на памяшканьне мясцовай арганізацыі кампартыі і арыштавала двух сяброў ЦК і яшчэ 25 камуністаў толькі на падставе таго, што яны сябры партыі.

На нарадзе сэкратароў калгасных і савгасных ячэек КП(б)Б.

Узброіць калгасьнікаў і савгасьнікаў камуністаў марксысцка-ленінскімі ведамі—гэта пэўны сродак перамогі.—Больш згуртуем бядняцка-серадняцкую масу сялянства пад кіраўніцтвам кампартыі супроць кулака, за калектывізацыю.—Далей разгортваць масавую калектывізацыю, аб'яднаючы вёскі, раёны.

Супроць лжэкалгасаў! Упарадкуем кіраўніцтва.

(ПРАМОВА ТАВ. МІЦЬКОВА).

КАЛЕКТЫВІЗАВАЦЬ ВЁСКАМІ.

На сёньняшні дзень у нашай рабоце рашаючымі павінны быць такія мэтады, якія забясьпечылі-б нам разгортваньне ў сапраўднасьці масавую калектывізацыю, якія забясьпечылі-б нам найбольшыя і найлепшыя вынікі з меншай затратай сродкаў.

Правесьці такую вялікую работу, якую мы ўжо праводзім,—абагуліць дзесяткі тысяч індывідуальных гаспадарак у калгасы—для гэтага патрэбна ня мала грошай, і перад намі ставіцца пытаньне адшукаць такія мэтады, якія ня толькі ня зьніжалі-б тэмпу, а наадварот павялічвалі-б яго пры найменшай затраце сродкаў дзяржавай і большым уцягненьні сродкаў самога насельніцтва.

Зараз пры такім масавым імкненьні сялянства ў калгасы нам трэба браць стаўку, дамагацца аграмаджваць не паасобныя гаспадаркі, а цэлыя вёскі адразу, як пры арганізацыі калгасу, і таксама пры пашырэньні існуючага. Мы такім мэтадам захоўваем сродкі, будзем мець больш сродкаў і магчымасьцяў для забясьпечаньня гаспадарчымі будынкамі, сродкамі вытворчасьці і г. д.

Нам трэба старацца аграмаджваць не паасобныя гаспадаркі, а цэлыя вёскі, цэлыя пасёлкі. Ня будзе бяды, калі гэтыя вёскі будуць жыць у сваіх хатах у працягу 2-5 гадоў. Справа ня ў тым, каб у першы год былі пабудаваны новыя хаты, а ў тым, каб быў большы і лепшы ўраджай.

У некаторых мясцох ужываецца такі мэтад, што для калектывізацыі выбіраюць некалькі вёсак, камандыруюць туды пэўны лік камуністаў, якія ў працягу 2-3 тыдняў вядуць сыстэматычную працу сярод насельніцтва гэтых вёсак. У першую чаргу яны арганізуюць беднату і батрацтва, жанчын, вядуць работу сярод актыву і, нарэшце, праз 2-3 тыдні маюць такія вынікі, што цэлыя вёскі ідуць у калгас. Але гэта дае ім магчымасьць заставацца на першыя гады ў старых хатах, не будаваць будынкі, але перабудоўваць непасрэдна гаспадарку. Гэты мэтад зусім правільны, нам трэба яго замацаваць і ўжываць.

БОЛЬШ АГРАМАДЖВАЦЬ, УЗЬНЯЦЬ ЖЫВЁЛАГАДОЎЛЮ.

Другое пытаньне, якое мае вялікае значэньне,—гэта аграмаджаньне сродкаў вытворчасьці. Праўда, у нас ня дрэнна з аграмаджаньнем коняй, з аграмаджаньнем сельска-гаспадарчага інвэнтару, але ў нас надзвычайна д р э н н а з аграмаджаньнем малочнага стада і іншай жывёлы, нават у старых гаспадарках, якія даўно ўжо існуюць; мы часта сустракаемся з тым, што жывёла не аграмаджваецца, і жывёлагадоўлі, якая зьяўляецца галоўнейшай з галін нашай гаспадаркі, надаецца мала ўвагі.

Возьмем Дняпроўскую камуну Гомельскай акругі: гаспадарка як трэба добра пастаўлена, і добры ўраджай, парадак і ячэйка была нішто сабе па колькасьці, але жывёлагадоўля там пастаўлена вельмі дрэнна, у іх каровы такія-ж як і ў суседніх сялян, кормяць жывёлу абы як. Гаспадарка існуе 7-8 год, але да гэтага часу не вядзецца правільнае кармленьне.

І вось я хацеў-бы, каб адным з практычных заданьняў, якія мы з вамі прымем у выніку нашай нарады, паставіць, каб ніводная гаспадарка не вяла так работу, як вядзе Дняпроўская камуна, а каб ва ўсіх гаспадарках пытаньні жывёлагадоўлі займалі належнае месца, каб мы перайшлі да рацыянальнага кармленьня, заняліся кармавою базаю, каб мы абавязкова на працягу будучага году наладзілі сіласаваньне. Сэкратары ячэек кіруюць гаспадаркаю, а колькі разоў яны ў сябе на ячэйцы абгаварвалі пытаньне, як наладзіць сіласаваньне? Я ўпэўнен, што ня выкананы зданьні ЦК аб пабудове сіласных ям, і ня толькі яны, але і тыя арганізацыі, якія павінны былі дапамагчы ім, не зьвярнулі належнай увагі.

РАШУЧА ЗМАГАЦЦА З ЛЖЭКАЛГАСАМІ.

Пытаньне наконт непадзельных капіталаў. Тут ёсьць адна небясьпечная тэндэнцыя. У шэрагу месцаў пад відам калгасаў і нават камун хаваюцца лжэкалгасы якія, прыкрываючыся статутам у некаторых мясцох акулачваюцца, нават там, дзе ёсьць камуністы. Гэта таму, што нашы таварышы не даацэньваюць значэньня росту і ўтварэньня непадзельных капіталаў. Вось, напрыклад, у Хоцімскім раёне, Магілеўскай акругі, ёсьць старая досыць моцная гаспадарка; там ёсьць некалькі камуністаў. Непадзельныя капіталы там складаюць паўтараста рублёў, а індывідуальнае накапленьне ўкладаў—больш. Там у членаў партыі ёсьць уклады па 3 тыс. руб., яны і проценты маюць. Такая гаспадарка, зразумела, расьце ня ў бок сацыялізму, а пад відам калгасу тут расьце кулак. І гэта гаспадарка, дзе ёсьць камуністы, ня хоча пашырацца.

Другая гаспадарка Мазырскай акругі. Баланс яе складае 50 тыс. руб., а непадзельныя капіталы 180 руб., а ўклады—паўтары тысячы рублёў. Прычым уклады ня тыя, што яны прынесьлі з сабой у калгасы, а ўклады ад прыбыткаў. Далей, у Чэрыкаўскім раёне за паўтары вярсты ад Чэрыкава ёсьць калгас, які ў мінулым годзе меў 3.600 руб. чыстага прыбытку, а ў непадзельныя капіталы ён адлічыў—нуль, а на ўклады—па 250 руб.

Вось такая тэндэнцыя, папершае, вельмі шкодная і надзвычайна небясьпечная. Калі мы ня будзем стала сачыць за гэтым, дык такія тэндэнцыі будуць весьці да адрыву гэтых гаспадарак і нежаданьня падпарадкавацца нашаму кіраўніцтву. Ёсьць ужо такія факты, калі пераросшыя свой адбудоўчы пэрыяд і індывідуальна (а не калектыўна) узмацнеўшыя гаспадаркі ужо адмаўляюцца выконваць свае абавязкі перад пралетарскай дзяржавай. У нас, у Аршанскай акрузе, адзін калгас катэгарычна адмовіўся ад кантрактацыі; у Бабруйскай акрузе шэраг гаспадарак выконваюць так свае абавязкі перад пралетарскаю дзяржаваю, што 12 проц. сваіх таварных лішкаў яны аддаюць прыватніку.

І таму непадзельныя капіталы трэба шпарчэй узмацняць, уся тая маёмасьць, якая набываецца за кошт крэдыту, павінна ісьці ў непадзельныя капіталы.

За гэты год з агульнай сумы атрыманага крэдыту 30 тыс. руб. размеркавана індывідуальна паміж калгасьнікамі.

Каб гэтага ня было, у першую чаргу павінен быць кантроль камуністаў, партыйных ячэек, якія там ёсьць, бо па сутнасьці гэта-ж усё недапушчальныя рэчы.

Другое—тая сума, на якую ёсьць ільготы па сельска-гаспадарчаму падатку, штогод павінна дабаўляцца да сумы непадзельных капіталаў.

Далей, пэўныя адлічэньні ад чыстых прыбыткаў таксама трэба ўносіць у непадзельны капітал. Да гэтага часу нашы кіруючыя органы спрачаюцца, як тут адлічаць—ці ад умоўна чыстага прыбытку, ці ад чыстага прыбытку, ці як інакш. А пакуль яны спрачаюцца некалькі гадоў, пранырлівыя людзі ўсё гэта выкарыстоўваюць.

УПАРАДКАВАЦЬ ЗАРАБОТНУЮ ПЛАТУ, НАЛАДЗІЦЬ РАХУНКАВОДЗТВА.

З гэтым зьвязана і пытаньне аб устанаўленьні заработнае платы. Я падам вам прыклад з аднэй гаспадаркі. Гаспадарка мае 60 гэкт., толькі год таму назад арганізавалася і заработную плату аплачвае крэдытам, прычым яны ўстанавілі, што рабочы дзень мужчыны ацэньваецца ў 3 р. 50 к.

Прыблізна вылічылі, колькі грошай гэта будзе каштаваць, і аказалася, што калі-б яны выплачвалі такую зарплату, то павінны былі-б выплаціць у тры разы больш, чымся той прыбытак, які яны маглі атрымаць за гэты год. А шмат ёсьць такіх фактаў; тут трэба пільна сачыць, каб размеры зарплаты цьвёрда грунтаваліся на гаспадачых магчымасьцях, каб не праядалі асноўнага капіталу.

УПАРАДКАВАЦЬ РАХУНКАВОДЗТВА І КІРАЎНІЦТВА.

Наступнае пытаньне надзвычайна балючае—гэта рахункаводзтва. Тут дрэннае становішча.

Я сёньня ўночы чытаў 30 дакладаў таварышоў, якія спэцыяльна абсьледвалі калгасы вясною, калі праводзілася суцэльнае абсьледаваньне па лініі ЦСУ. Я толькі ў адным дакладзе знайшоў, што рахункаводзтва больш-менш здавальняюча пастаўлена. У іншых 29 дакладах усё нездавальняюча і нездавальняюча. Да чаго гэта вядзе? Гэта вядзе да блытаніны, да няправільнага гаспадараньня і г. д.

Я высоўваю такое пытаньне на ваша абгаварэньне: ці ня варта нам у зьвязку з тым, што мы ня можам у кожнай гаспадарцы мець зараз рахункавода, каб мы ў калгасе ўвялі самыя простыя прымітыўныя запісы, якія не патрабуюць ніякага ўменьня, і зрабіць сталую бухгальтэрыю ў кустовых аб'яднаньнях, дзеля чаго ўжо канчаткова распрацоўваюцца бухгальтарскія кнігі.

Яшчэ адно пытаньне высоўваю на абгаварэньне—гэта пытаньне аб сыстэме кіраўніцтва. На сёньнешні дзень ужо са ўсёй рашучасьцю паўстае пытаньне: што нам лепш мець, ці райкалгассаюз, ці акркалгассаюз?

Я высоўваю пытаньне: ці ня варта, каб у раёнах поўнай калектывізацыі, дзе ўжо на сёньнешні дзень ахоплена 30 проц., арганізаваць райкалгассаюзы з некалькімі спэцыялістамі і адным сталым кіраўніком-старшынёй. Пры поўнай калектывізацыі мы ня зможам драбней куставаць, як у маштабе раёнаў. Мы ня зможам буйныя індустрыяльныя прадпрыемствы будаваць драбней, чым у раённым маштабе.

Узьняць тэарэтычны ўзровень.

Савгасныя і калгасныя ячэйкі КП(б)Б зьяўляюцца нашым перадавым атрадам у барацьбе супроць кулака на вёсцы.

(ПРАМОВА ТАВ. СЯНКЕВІЧА).

КАЛЕКТЫВЫ І КАМУНЫ ПАВІННЫ БЫЦЬ УЗОРНЫМІ.

Нашы савгаскія і калгаскія ячэйкі зьяўляюцца на вёсцы тымі вышынямі, адкуль мы вядзем наступ на капіталістычныя элемэнты вёскі, праз якія мы праводзім сацыялістычную рэканструкцыю індывідуальнай сельскай гаспадаркі. І таму партыйная работа ў гэтых арганізацыях павінна быць пастаўлена так, каб гэтыя нашы вышыні—савгасы, калгасы, камуны,—наогул калектывы былі ўзорнымі для ваколічнага сялянства, каб бядняк і серадняк сваімі ўласнымі вачыма бачыў у іх перавагу буйнай калектыўнай сельскай гаспадаркі над гаспадаркай індывідуальнай. Але ў жыцьці мы не заўсёды гэта наглядаем. Старшыня Белсельтрэсту ўжо даваў лічбы, колькі рабочых дзён выпадзе на адзін гэктар у розных савгасах. Гэтыя лічбы гавораць аб тым, што некаторыя ячэйкі і рабочкомы плятуцца ў хвасьце адсталых рабочых савгасаў. Нашы камуны таксама не заўсёды зьяўляюцца ўзорнымі; ёсьць камуны, што існуюць па 12 год, якія арганізаваліся на лепшых былых абшарніцкіх землях, атрымалі стотысячныя крэдыты, і сёньня мы бачым, што яны замкнуліся ў сабе, не аб'ядналі ніводнага сялянскага двара навакол сябе.

КУЛАЦКІ ПАДПАЛ—КОНТР-РЭВАЛЮЦЫЙНАЯ ВЫЛАЗКА.

У той клясавай барацьбе, якая разгортваецца навакол калектыўнага будаўніцтва, якая з кожным днём абвастраецца, нашы партыйныя ячэйкі ў савгасах і калгасах зьяўляюцца перадавым авангардам у барацьбе супроць кулака, падкулачніка і г.д. Тут шмат гаварылася аб тым тэроры, які ёсьць з боку кулакоў. Нашы карныя органы не заўсёды па-пралетарску падыходзяць да гэтых выпадкаў. Таварышы прыводзілі прыклады мяккіх адносін з іх боку да кулака, і я думаю ў гэтым ёсьць значная доля праўды. Трэба, каб падпал ці напад на нашых працаўнікоў не разглядаўся, як простае хуліганства ў звычайным крымінальным парадку, а каб кулак, які вышаў на барацьбу з намі са стрэльбаю і з чырвоным пеўнем, разглядаўся, як контр-рэвалюцыянэр. Нашы посьпехі ў барацьбе з кулацтвам залежаць ня толькі ад барацьбы нашых карных органаў, але і ад таго, наколькі мы дзеля гэтай барацьбы згуртуем бядняцкія, батрацкія масы. І вось работа сярод беднаты, мабілізацыя яе на барацьбу з кулаком зьяўляецца таксама першачарговай задачай.

УЗМАЦНІЦЬ ПАРТКІРАЎНІЦТВА.

Клясавая барацьба ідзе ня толькі навакол савгасаў. Мы павінны добра ўявіць, што з момантамі, калі мы пераходзім на масавую калектывізацыю, на калектывізацыю нашых сельсаветаў і нават раёнаў, гэта клясавая барацьба будзе разьвівацца і ўнутры калгасаў. Мы ўжо маем адзнакі гэтай клясавай барацьбы. Бо як назваць, як ня вылазкамі клясавага ворага тое, калі некаторыя калгасы адмаўляюцца даць дзяржаве свае лішкі і прадаюць іх прыватніку? І таму нам трэба асаблівую ўвагу зьвярнуць на арганізацыю ўнутры калгасаў бяднейшай і батрацкай часткі на ўзмацненьне партыйнага кіраўніцтва калгасамі.

ГАЛОЎНЫМ ЧЫНАМ КАЛГАСАМ І САВГАСАМ.

Калгаснае будаўніцтва з пераходам да масавай калектывізацыі набывае надзвычайна важнае значэньне. Тут перад намі выступае пытаньне пляну і землеўпарадкаваньня і аграномічныя пытаньні і пытаньні ўнутранага распарадку, разьмеркаваньне сіл, устанаўленьне аплаты, што мае асабліва вялікае значэньне. Усе гэтыя пытаньні надзвычайна складаныя і патрабуюць ад сэкратароў ячэек, ад арганізатараў калгасу большага тэарэтычнага ўзроўню. І таму падняцьце культурнага ўзроўню ўсёй калгаснай масы і асабліва перадавой яе часткі, нашых членаў партыі набывае першачарговае значэньне. ЦК КП(б)Б ужо даў указаньні ўсім нашым органам і Наркамасьветы, і кааперацыі, і іншым, каб яны будавалі ўстановы і сваю работу праводзілі галоўным чынам там, дзе ёсьць савгасы і калгасы. Перад намі стаіць задача ліквідацыі няпісьменнасьці і адносна да калгасаў мы паставілі задачу ліквідаваць няпісьменнасьць сярод мужчын і жанчын у два гады; перад намі стаіць задача абслужыць у першую чаргу калгасы хатамі-чытальнямі, кіно-перасоўкамі, радыё і іншымі культурнымі ўстановамі; мы павінны арганізаваць дэлегацкія сходы жанчын у першую чаргу навакол савгасаў, там дзе ёсьць калгасы. І тут жа таксама мы павінны завастрыць увагу наконт партыйнай асьветы, бо культурны ўзровень нашых вясковых камуністаў, як паказвае чыстка, зьяўляецца надзвычайна нізкім. Я лічу, што нашы т.т., якія працуюць у савгасах і калгасах, мала чым адрозьніваюцца ад астатняй масы партыйцаў на вёсцы. І таму галоўную ўвагу трэба накіраваць на тое, каб наша партыйная асьвета—палітшкола, савпартшкола, адзіная школа абслугоўвала ў першую чаргу нашы калгасы і савгасы. Мы павінны прынамсі мець адну школу-перасоўку ў гэтую зіму ў тых раёнах, дзе мы маем калгасныя аб'яднаньні, у раёнах масавай калектывізацыі.

РАЗГАРНУЦЬ ЗАВОЧНАЕ НАВУЧАНЬНЕ.

Зразумела, мы ня можам ахапіць школаю ўсіх працаўнікоў на вёсцы пры іх раскіданасьці і г. д. Адсюль надзвычайна вялікае значэньне набывае завочнае навучаньне і самаадукацыя. Аб гэтым ёсьць дырэктывы ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б, і трэба завочнае навучаньне і перападрыхтоўку партактыву правесьці ў першую чаргу сярод кіраўнікоў ячэек у калгасах і савгасах.

Мы думаем размеркаваць 600 завочнікаў ва ўсебеларускай гомельскай завочнай савецкай партшколе. Гэтае завочнае навучаньне будзе праходзіць такім чынам: вам б у д у ц ь пасылацца заданьні, падручнікі, завочная кансультацыя; ч а с а м да вас будуць прыяжджаць т. т., каб праводзіць канфэрэнцыі, а ў канцы году будуць склікацца паўтарамесячныя і 2-хмесячныя курсы, каб перапрацаваць сумесна з выкладчыкам тое, што вы праходзілі завочным шляхам. Пытаньню завочнай самаадукацыі вы павінны надаць першачарговую ўвагу, час для гэтага пры жаданьні вы знойдзеце; усё-ж такі жыцьцё на вёсцы ідзе больш слабым тэмпам, чымся ў горадзе, і пры ахвоце, пры рацыяналізацыі работы можна знайсьці дзьве гадзіны ў дзень, альбо 2-3 на працягу 2 тыдняў для вучобы.

Вялізарнае значэньне набывае пытаньне вярбоўкі членаў партыі. Да гэтага часу, як паказаў перапіс камуністаў на вёсцы, мы мелі 2 проц., а ў Віцебскай акрузе нават 4 проц. кулакоў у нашых вясковых арганізацыях.

Мы мелі да 60-70 сераднякоў у нашай арганізацыі і толькі да 40 проц. беднаты. Нам трэба кардынальна вырашыць, каго мы павінны ўцягваць у партыю. Наша партыя зьяўляецца партыяй пралетарыяту, і ў першую чаргу—уцягваць пралетарскія, паўпралетарскія элементы вёскі, з серадняцкай часткі мы можам браць тых камуністаў, якія адракліся, якія зжылі сваю індывідуальную псыхалёгію, якія сёньня, уваходзячы ў партыю, адракаюцца ад сваёй індывідуальнай гаспадаркі і пераходзяць на калектыўную гаспадарку.

Мы павінны ўзмацніць калгасы працаўнікамі-камуністамі з гораду: з нашых ВУЗ-аў, з нашых савпартшкол мы павінны пасылаць у першую чаргу працаўнікоў у тыя раёны, дзе пачынае хуткім тэмпам разьвівацца калектывізацыя.

Як мы арганізоўвалі калгас

(ГУТАРКА З СЭКРАТАРОМ ПАРТЯЧЭЙКІ КАЛГАСУ „КАМУНАР ГІЛЕЎШЧЫНЫ“ ТАВ. ФЕДАСЕНКАМ).

У сучасны момант наш калгас зьяўляецца адным з самых буйных на Беларусі. Ён аб'ядноўвае 13 вёсак, што складае 80,5 пр. да ўсяго насельніцтва сельсавету, аб'ядноўвае 402 сям'і (2900 душ) і займае плошчу ў 6000 гэктараў.

Калгас арганізаваўся ў вясеньнюю пасеўную кампанію гэтага году.

Тав. ФЕДАСЕНКА.

Пры арганізацыі калгасу мы спаткаліся твар з тварам з клясавым ворагам. Адбывалася яшчэ нябывалая барацьба паміж беднатой і кулацтвам. Кулаччо выпрабавала ўсе мэтады барацьбы: пагрозы, тэрар подкупы, шкодніцтва, агітнук цыю і г. д.

Кулакі лавілі на полі бядняцкія выколвалі ім вочы, калечылі кароў залі вымя ў каровы), кралі ў нам інструмант і псавалі яго, пагражалі ным актывістам, стараліся прыцян свой бок серадняцтва і нават сваіх іх дзяцей натраўлівалі на дзяцей ты, і там ішла рукапашная барацьб ну сельсавету бядняцкі Журкевіч далі запіскі, пагражаючы тэрарам. маўшы рашучы адпор, кулаччо разлажыць калгас знутры. Для гэта падкупілі падкулачніка Інаценка, уступіў у калгас, адкуль пачаў за шкодніцтвам. Інаценка агітаваў уве супроць калгасу і, урэшце, у часе насеньня знарок паламаў сарціроў зараз выключан з калгасу і знахо пад сьледзтвам.

Зараз наш калгас моцны, і кула адбой, бо з пад іх уплыву вырваны нія дзевяць бядняцкіх гаспадарак надоечы пад чырвоным сьцягам п лі з заявай да нас на поле і пача сіцца ў калгас. Бедната паклялася ня верыць кулацкім байкам і прасі цягнуць да адказнасьці кулакоў-шко

У дзень калектывізацыі падалі аб уступленьні ў калгас 130 гаспад ваколічных вёсак з просьбай далуч да калгасу. Гэта пытаньне канч ўжо вырашана, і, такім чынам, у лёкім часе наш калгас будзе аб' 530 сем'яў на плошчы 8000 гэк У калгасе ёсьць ячэйка КП(б)Б (1 ячэйка ЛКСМ (23 ч.) і досыць моцн гаены актыў.

Такія шляхі нашага калгасу.

ФЭЛЬЕТО

Пагражаючая небясьпека.

Крытыка=аналіз=аб'ектыўнаму вывучэньню рэчаў.

Псыхааналіз=разуменьню «душы» суб'екта.

Крытыкааналіз+псыхааналіз=якім-небудзь вывадам.

Гэтым мэтадам карыстаецца старшыня Мсьціслаўскага райвыканкому Буякоў.

Гэтым мэтадам будзем карыстацца і мы.

Першае: што такое кулак?

І якое яго значэньне ў суадносінах клясавых сіл вёскі?

І якую ён небясьпеку выяўляе ў сучасным пэрыядзе гісторыі?

І ці выяўляе ён якую-небудзь небясьпеку?

І ці ёсьць наогул кулак на с кай зямлі?

Раней, чым адказваць на кола запытаньняў, адрэкамендуем Бу нашым чытачом; уласьнік вараб спрытнасьці, псыхалёг надворнай лы, філёзоф 2×2=?, аўтар лёгк ных тэорый і хатніх гіпотэз.

А зараз адкажам словамі самага якова:

— Бязумоўна, таварышы, пры чы пад увагу, надаючы сур'ёзна выходзячы з абставін, неабходна знаць, што кулак ёсьць. Кулак і ў нашым раёне, і ў Дрыбінск ў Горацкім, і ва ўсёй Аршанш Але, таварышы, мы ня толькі ст стыкі. Мы яшчэ ўмеем аналіза факты. Аналіз паказвае: у нашых вах кулак не выяўляе аніякай бясьпекі.

Хопіць! Што за небясьпека—ку Вось ён, Мацей Рыгорыч, так з кулак, досыць часта заходзіць у нет Буякова. Ну, што-ж небясьпе ў яго постаці? Лапці яго не адро ваюцца ад лапцей бедняка і сьв белая, сялянская ды з лапікамі А калі паглядзець на твар, то вясі радасьць за сацыялістычнае будаўі ва ўбачыш на ім, і—ніякай адз клясавай барацьбы.

Не, таварышы, не, паважаныя, мыляецеся ў сваіх поглядах! Кулак якай небясьпекі не выяўляе на да этапе гісторыі! Мацей Рыгорыч мі ўрастае ў сацыялізм!

Дарогу Мацею Рыгорычу!

У калгас!

У камуну!

Але ўсё-такі сябры Выхрынскай муны выключаюць кулакоў з калг Прамова Буякова на сходзе парт'яч кі церпіць аварыю. Старшыня рай канкому апыняецца на становішчы нэрала бяз войська.

Ня толькі сонца, што ў вакне. Выхрынскай партыйнай ячэйцы сь клінам ня зышоўся. Ёсьць раённая п тыйная арганізацыя, ёсьць райком п тыі. І Буякоў імкнецца падпарадкава сабе партыйны актыў.

На пасяджэньні бюро райкому па тыі, прысьвечаным правядзеньню «Д ўраджаю і калектывізацыі», Буяк выступіў з прамоваю.

— За апошні час,—сказаў кіраў раёну,—мы наглядаем стыхійны р калектыўных гаспадарак.

Ну, што-ж, скажа чытач, стыхій рост калгасаў сьведчыць аб перава насьці калектыўнай формы землякар станьня над дробнаўласьніцкай, інд відуальнай, а раз так, то паліты савецкай улады правільная, адпавя запатрабаваньням жыцьця. Але ў шэні старшыні райвыканкому ёсь буякоўскія погляды.

— Гэта выяўляе для нас пагражаючую небясьпеку.

Якая-ж для нас небясьпека? То што мы наступаем на капіталістычн элементы вёскі? Выбіваем з акоп Мацея Рыгорыча? Будуем сацыялісты ную гаспадарку? Буякоў на гэтыя пы таньні адказу не дае. Ён пераходзі да вываду:

— Пакуль ня позна, трэба затр маць шпаркі тэмп калектывізацыі, арганізацыйна мы ня справімся кір ваць калгасамі.

Якім імем называюцца такія выв ды? Капітуляцыяй перад цяжкасьцям Дызэртырствам з гаспадарчага фронт Накіроўваньнем вады на млын капіта лізму? Вылазкай клясавага ворага?

Мы таксама ня будзем адказваць н гэтыя пытаньні. Мы толькі зазначы што ў нас не прастаўляюць да сьцен кі калгас, а наадварот. І не расстрэл ваюць калектывізацыю, а наадварот.

Кажучы канкрэтней, у нас расстрэ ваюць погляды правых ухілістаў.

Палын.

Жорсткай самакрытыкай выкрыем права-апартуністычную практыку.

У Талочынскай партарганізацыі выкрыта скрыўленьне клясавай лініі, — Паасобныя зьвеньні савецкага апарату дапамагаюць кулаку і нэпману.—Бязьлітасная барацьба са скажэньнямі лініі партыі!

Праявы правага ўхілу ў Талочынскай партарганізацыі.

Адбыўся пазачарговы пленум Талочынскага райкому КП(б)Б, на якім абгавораны былі факты правага ўхілу і скрыўленьні клясавай лініі паасобнымі ячэйкамі і членамі КП(б)Б у час праводзімых апошніх гаспадарчых кампаній.

Пленум райкому рашуча асудзіў праваўхілісцкія тэндэнцыі і намеціў шляхі выпраўленьня дапушчаных памылак.

Пры арганізацыі калгасу ў вёсцы „Новае Сяло“ у склад калгасу быў прынят б. стражнік-лішэнец, які пасьля ўступленьня ў калгас зараз-жа пачаў хадайнічаць аб аднаўленьні яго ў выбарчых правах.

У „дзень ураджаю і калектывізацыі“ у Друцкім і Славенскім с-с., дзе былі арганізаваны калгасы, — прыняты 4 кулакі індывідуальнікі. Ячэйка КП(б)Б была з боку і не цікавілася сацыяльным складам калгасаў, а с-савет так быў блізарукі, што зацьвердзіў сьпіс калгасаў з кулакамі і толькі РВК заўважыў каго прынялі ў калгас.

У Валасоўскім с-с. гаспадарку папа абклалі с-г. падаткам, як бядняцкую гаспадарку і акрамя гэтага была дадзена яму льгота, як сям'і чырвонаармейца.

Ня дрэнна жыве і маляўскі поп у Славенскім с-с., які таксама недаабложан падаткам.

Толькі цяпер выяўлена Славенскім і Плоскім с-с. 6 тыпічна кулацкіх гаспадарак, якія да гэтага часу ня былі абкладзены ў індывідуальным парадку.

Дырэктывы ўраду аб спагнаньні сельска-гаспадарчага падатку з кулацкіх гаспадарак да 15 кастрычніка на выконваюцца. Старшыня Мархлеўскага с-с. ідзе на ўступкі кулакам і адтэрміноўвае спагнаньне з іх с-г. падатку.

Таксама нельга не адзначыць такіх фактаў, як недаабклажэньне прыватных млыноў памольным зборам, хаця ў гэтым віна ня толькі РВК, але і вышэйшых акруговых установ. Славенскі млын не даабложан на 2000 пуд., не даабложан Маляўскі прыватны млын на 1000 пуд.

У Талочынскім спажывецкім т-ве нявыкарыстана 2000 руб. фонду на каапэраваньне беднаты. Старшыня праўленьня т-ва т. Ліпоўскі заяўляе, што „не каапэраванай беднаты няма“, а калі праверылі толькі ў адным Азерацкім с-с., у некалькіх вёсках, то выявілася каля 50 гаспадарак бядняцкіх, якіх трэба каапэраваць. У тым-жа т-ве зноў прынят на працу былы гандляр Думін, які ў мінулым годзе пастановай РСІ з працы быў зьнят.

Слаўнаўскае спажывецкае т-ва мае больш чым пахваліцца: там бухгальтарам працуе сын равіна. Праўленьне асабліва чула клапоціцца аб сваіх пайніках-заможніках і ня прымае ніякіх крокаў, каб спагнаць поўнасьцю з іх пай, а выносіць сваю пастанову аб устанаўленьні паю ў 30 руб. для іх. Мабыць таксама за што хваліць прыватнікі і гандляры праўленьне Слаўнаўскага спаж. т-ва, бо апошняе да 17-га кастрычніка забясьпечвала іх „кашэрным“ мясам па 56 кап. кілё, калі ў прыватніка каштуе 75 кап. Да гэтага часу ўсю жывёлу для т-ва рэзаў сам равін і за гэта яму плаціла рэлігійная абшчына. Старшыня праўленьня тав. Харытоненка ніколі не цікавіўся, што робіцца ў мясной краме. У выніку б. гандляр Пэўзьнэр—загадчык мясной крамы забясьпечваў мясам гандляроў, нават з ваколічных мястэчак.

Найбольш яскравыя факты скрыўленьня клясавай лініі, якія сьведчаць аб абсалютнай клясавай сьлепаце асобных працаўнікоў і некаторых сельскіх камісій па садзейнічаньню рэалізацыі хлебазагатовак, выявіліся ў 6 с.-с. Замест налажэньня ўсёй цяжкасьці па хлебазагатоўках на кулацкія гаспадаркі, там правялі інакш,—ня толькі не даабклалі кулакоў, але нават ёсьць выпадкі, калі на кулацкія гаспадаркі зусім нічога ня было налажана, у той час як пераабклалі серадняцкія гаспадаркі. Вось толькі некалькі яскравых фактаў:

У Азерацкім с-с.—Асіпенка С., індывідуальнік, плаціць падатку 189 р., мае 15 дзес.—налажана было 4 пуд., Залескі А.—індывідуальнік, плаціць падатку 132 руб., мае 15 дзес.—налажана было 7 пуд., Аніковіч М.—індывідуальнік, падатак 224 руб., мае 10 дзес.—налажана было 17 пуд., Будкевіч С.—індывідуальнік, падатак 225 руб., мае 14 дзес.—налажана было 15 пуд., Шаматульскі І.—індывідуальнік, падатак 162 руб., мае 12 дзес.—налажана было 10 пуд.

А як падыйшлі пры разьмеркаваньні налажэньня хлебазагатовак на серадняцкія гаспадаркі: Аскерка—які плаціць падатку 21 руб., сям'я чырвонаармейца—налажана 50 пуд., а на індывідуальніка Пятроўскага, які плаціць падатку 407 руб. налажана толькі 60 пуд. Ня менш характэрна другі прыклад: Асіпенка П.—індывідуальнік, плаціць падатку 195 руб., абложан 20 пуд. і слабасерадняцкая гаспадарка Сантука, якая плаціць падатку 12 р.—таксама 20 пуд.

У вёсцы Нарэчча Азерацкага с-с., дзе ёсьць 42 гаспадаркі, 13 аслабанены зусім ад падатку, 10 гаспадарак, якія плацяць падатку да 10 руб., такім чынам большасьць беднаты, аднака-ж там не даабложана 7 кулацкіх гаспадарак па хлебазагатоўках. З гэтага магчыма сьмела зрабіць вывад, што мясцовая ячэйка КП(б)Б не вядзе там сталай працы з беднатой і не падрыхтавала яе да кампаніі па хлебазагатоўках.

Аналёгічныя выпадкі з недаабклажэньнем па хлебазагатоўках кулацкіх гаспадарак мелі месца ў Мархлеўскім, Славенскім, Плоскім с.-с. У двух вёсках нават кулакі былі абраны ў сельскія камісіі па рэалізацыі хлебазагатовак. Яны налажылі на сябе толькі па 5 пуд. У Воўкаўскім с.-с. кулак, які плаціць падатку 400 руб., зусім ня быў абкладзены, а ў гэтай вёсцы праводзіў сход член партыі тав. Ліпоўскі.

Па Слаўнаўскаму с.-с. у вёсцы Кулікаўка зусім была праведзена «ураўнілаўка» разьмеркаваньня здачы хлебных лішкаў. Сход там праводзіў камсамолец Луцкі.

У вёсцы Заднева, дзе маецца толькі адзін індывідуальнік Туркоў Р., які плаціць падатку 122 руб., зямлі мае 13 дзес., буйнай жывёлы 5 шт., дробнай жывёлы 7 шт., налажана толькі—25 пуд. Цікава, што сын і нявестка Туркова зьяўляюцца настаўнікамі, другі сын яго працуе рахункаводам у канторы жэлезкома на ст. Коханава, а трэці сын сьледчы ў Полацку. Ня гледзячы на гэта Туркоў не пажадаў поўнасьцю здаць сваіх лішкаў збожжа.

С. Ат.

Безгаспадарчасьць і безадказнасьць.

(Горацкі раён, Аршаншчына).

Горацкі раён адзін з буйных раёнаў Аршаншчыны, там знаходзіцца Беларуская С.-Г. Акадэмія і патрэбна было-б чакаць ад с.-г. Таварыства добрай працы ў справе рэканструкцыі сельскае гаспадаркі. Але-ж к вялікаму жалю гэтага ў практычнай працы т-ва няма. Т-ва лічыць, што арганізацыя спэцыяльных вытворчых аб'яднаньняў, як прыкладна, машынных, ільноапрацоўчых і г. д., ня ёсьць справа с.-г. крэдытнага т-ва.

Выходзячы з такой праваапартуністычнай устаноўкі, таварыствам праведзена вясеньняя пасеўная кампанія. Аб грубым скрыўленьні лініі партыі ў час вясеньняй пасяўной кампаніі кажуць наступныя факты: з 1-га кастрычніка 1928 г. па 1-ае ліпеня 1929 г. выдана розных пазык 29697 р., а спэцыяльна вытворчых каапэрацыйных аб'яднаньняў не арганізавана ні аднаго. Раздана машыннага крэдыту 6029 р., засталося нескарыстаным 16425 р., а машыннага т-ва не арганізавана ніводнага ў той час, калі сельская гаспадарка адчувае вялікае запатрабаваньне ў с.-г. машынах, калі праз машынныя т-вы і іншыя спэц. вытворчыя аб'яднаньні ўзмацняецца тэмп калектывізацыі сельскае гаспадаркі, чым робім наступ на капіталістычныя элемэнты вёскі. А вось яшчэ факты. У Горацкім с.-г. т-ве засталося на складах нескарыстанага гатункавага аўсу 6662 кгр., канюшыны 80 кгр., ільно-семя 7442 кгр., калійнай солі 1200 кгр., буракоў 1483 кгр. Гэтыя факты яскрава кажуць, што Праўленьне Горацкага т-ва надзвычайна безадказна аднеслася да вялізарнейшай палітычна-гаспадарчай кампаніі, вось чаму ў двух пасёлках Гошчы і Навіна, у якіх адведзены былі палі для засеву аўсом, засталіся незасеянымі.

На каапэраваньне беднаты ўтвораны быў фонд у суме 575 р., а на 1-е ліпеня 1929 г. не скарыстана было 295 р., у той час, калі ў момант вясеньняй пасеўкампаніі выдана непайшчыкам 418 пазык. Тэмп каапэраваньня сельскай гаспадаркі ў Горацкім кр. с-г. таварыстве спыніўся, паявы капітал амаль не расьце. У справе ўстанаўленьня крэдытнай дысцыпліны сярод пайшчыкаў і выкананьня ўрадавага заданьня па збору пратэрміновак і датэрміновага спагнаньня неправільна выданых пазык амаль нічога ня робіцца. Пратэрміноўкі складаюцца: на 1-X-28 г. 10984 р., на 1-I-29 г. 15802 р., на 1-IV-15201 р., на 1-X-29 г. 16208 р. Такая праца праўленьня пагоршыла фінансавае становішча т-ва.

Урадавае заданьне аб скарачэньні на 20 проц. адміністрацыйна-гаспадарчых выдаткаў ня выканана ў Горацкім т-ве, дзякуючы таму, што штат т-ва вялікі. Безгаспадарчасьць прынесла перавышэньне гадавога каштарысу т-ва за 9 месяцаў працы на суму 5433 р.

Праўленьне т-ва мае дэфіцыт за 9 месяцаў гаспадарчай працы 3916 р. 83 к. Пытаньню загатовак не аддадзена належная ўвага, адчуваецца ў т-ве павольнасьць і самацёк. Закантрактаванае збожжа не паступае.

Праца Горацкага т-ва і тое становішча, у якім яно зараз знаходзіцца, патрабуе надзвычайна хуткага хірургічнага лячэньня.

К. Б.

Крэдыты не спаганяюцца.

(Мазыршчына).

Крэдытныя пратэрміноўкі ў Мазыршчыны прымаюць зацяжны характар і нават у асобных мясцох пераходзяць у хранічнае становішча. Па данным на 27 верасьня бягучага году налічвалася па акрузе пратэрміновак 51466 руб., а па асобных раёнах ад 1857 да 15832 руб., пры чым спагнаньне іх недастаткова разгорнута. Асабліва слаба ідзе спагнаньне пратэрміновак па Калінкавіцкаму, Нараўлянскаму, і Пятрыкоўскаму раёнам, дзе налічваецца да 27000 руб., ці больш усіх пратэрміновак па астатнім 7-мі раёнам акругі. У паказаных першых 3-х раёнах у першую чаргу трэба шукаць злосных і заможных неплацельшчыкаў.

Мэтады спагнаньняў пратэрміновак патрэбна зьмяніць, бо да гэтага часу працуюць і лічацца адказнымі за спагнаньне банкаўскіх крэдытаў Акрсельбанк, Акрсельсаюз і с-г крэд. т-вы, у той час, як дапамога Райвыканкомаў у гэтым недастаткова, а з боку сельсаветаў зусім адсутнічае. Міліцыя непадрыхтавана да прымусовых спагнаньняў пратэрміновак ад злосных неплацельшчыкаў. Усю працу па спагнаньню пратэрміновак патрэбна зьвязаць з усімі грашовымі спагнаньнямі.

Міхась Зелянёўскі.

Пракурорскія мухі і нэпманскія слані.

Сем нэпманаў, якія арганізавалі прыватнае таварыства „Слон“ па эксплёатацыі фабрыкі мэталёвых вырабаў (адзіная вытворчасьць у БССР), падкупіўшы свайго бухгальтара Зорына, на працягу пяці год утойвалі 105.000 руб. чыстага прыбытку, дзякуючы чаму не даплацілі дзяржаве 21.622 руб. падатку.

Бачыце, сем нэпманскіх сланёў—гэта, трэба разумець, адна рэч, а дзесяць аслоў з Менскага Акрфа—другая рэч. Ня будзе памылкай, калі мы далучым яшчэ сюды (бог, як кажуць, тройцу любіць), 2-3 верхаглядаў з Менскай Акрпракуратуры.

Апарат Акрфа на працягу пяці год, не правяраючы законнасьці вывадзімых прыватнікамі балянсаў, пад уплывам бюракратызму злачынна штампаваў утойваньне прыбытку.

Гэта справа зусім выпадкова была выкрыта НК РСІ яшчэ ў сьнежні 1928 году. Выкрыты злоўжываньні ня толькі прыватнікаў і іх падлізьніка бухгальтара Зорына, а нават злоўжываньні шэрагу асоб з Акрфа.

Злачынцы ходзяць і зараз непакаранымі, а пракуратура тымчасам займаецца „працэсуальнай мазьнёй“. Нэпманскі падпявала—бухгальтар Зорын—прыстасаваўся ў другім месцы: ён, бычыце, варочае ўжо справамі на галянтарэйнай фабрыцы.

Нам прыходзіцца папярэдзіць асоб з пракуратуры аб тым, што за такую гульню з рэчамі іншы раз прыходзіцца самім сядаць там, дзе непажадана. А мо'—«за адсутнасьцю складу злачынства» справа ўжо пакрылася „спынільнай палітыкай“, ці амністыі чакае?

Калі і будзе амністыя, дык будзьце ўпэўнены, што РСІ гэтай амністыі да самой пракуратуры не дапасуе.

Якуб.

Усю працу нашых школ падпарадкуем задачам сацыялістычнага будаўніцтва

Заменім традыцыйны сямідзённы тыдзень у нашых навучальных установах—пяціднёўкай

Палепшым культурнае абслугоўваньне калгасаў, уцягнем новыя сотні і тысячы беднякоў і сераднякоў у калгасны рух!

ШКОЛЫ—НА БЕСПЕРАПЫННЫ ТЫДЗЕНЬ.

У СПРАВЕ ПЕРАХОДУ НАВУЧАЛЬНЫХ УСТАНОЎ НА БЕСПЕРАПЫННЫ ТЫДЗЕНЬ НЯМА СТАЛАГА КІРАЎНІЦТВА.—КОЖНАЯ НАВУЧАЛЬНАЯ ЎСТАНОВА РАЗУМЕЕ ПЕРАХОД НА БЕСПЕРАПЫННЫ ТЫДЗЕНЬ ПАСВОЙМУ. НЕКАТОРЫЯ ШКОЛЫ ПЯЦІДНЁЎКУ АДМЕНІВАЮЦЬ СЯМІДНЁЎКАЙ І ШАСЬЦІДНЁЎКАЙ.—У СПРАВЕ ПЕРАХОДУ НАВУЧАЛЬНЫХ УСТАНОЎ НА БЕСПЕРАПЫННЫ ТЫДЗЕНЬ ПАВІННА БЫЦЬ ЦЬВЁРДАЯ ЎСТАНОЎКА НА ПЯЦІДНЁЎКУ.

ПАВОЛЬНЫМ ТЭМПАМ.

камасьветы ў свой час вылучыў ю для прапрацоўкі пытаньня аб дзе навучальных устаноў на бес-ынны тыдзень. Камісія, калі мы ляемся, ськладзена месяц таму а можа крыху і больш.

аньне пераводу на непрарыўку льных устаноў вельмі складанае, м здавалася, што за такі тэрмін "было-б зрабіць што небудзь тнае, каб ажыцьцявіць пастанотегіі Наркамасьветы. Але праца і праходзіла занадта павольным . Напрыклад, толькі пазаўчора кова вырашана пытаньне аб пее на пяціднёўку гарадзкіх школ ерапынным тыднём.

одзе папярэдніх падлікаў, пера- непрарыўку дасьць магчымасьць шасьці гарадзкіх школ сацвыху ыць двухзьменныя заняткі.

авод першага канцэнтру гарадзмігодак на бесперапынны тыз пяціднёўкай будзе праведзен якіх перашкод. Зусім іншы на- з пераводам на непрарыўку ў канцэнтры. Тут сустракаецца цяжкасьцяў. Большая частка нікаў другога канцэнтру працуе , а часам і ў трох школах. Ад- відаць, што дапасаваць расклад аў у некалькіх школах так, каб печыць настаўніка днём адна-,—пытаньне вельмі складанае. , пераход на непрарыўку ў другім канцэнтры выкліча перасоўку некаторай часткі нагрузкі ў асобных настаўнікаў і перасоўку іх працы паміж асобнымі школамі.

Камісія НКА вырашыла пераход на непрарыўку ў гарадзкіх школах ажыцьцявіць з 1 лістапада. Да першага лістапада застаўся адзін тыдзень, а ніхто з членаў камісіі, ды і сама камісія ў цэлым яшчэ ня маюць яснага пляну, як перамагчы паказаныя вышэй цяжкасьці.

Вясковыя сямігодкі вырашана пера весьці на непрарыўку з 15-20 лістапада, але і тут пытаньне яшчэ не прапрацавана належным чынам. Нам здаецца, мала вынесьці пастанову перавесьці з такога-та дню школы на непрарыўку, але трэба даць яшчэ ясную канкрэтную ўстаноўку—як гэта зрабіць і як перамагчы ўсе цяжкасьці, што сустракаюцца пры гэтай рэформе.

Пытаньнем аб пераводзе на непрарыўку прафшкол, тэхнікумаў, ВНУ і іншых навучальных устаноў камісія НКА не займалася. Нават больш таго, яшчэ толькі зьбіраюцца даць дырэктывы гэтым навучальным установам, каб яны самі разьвязвалі гэта пытаньне. Сказанае яшчэ больш пацьвярджае нашу думку, што вельмі павольным тэмпам прасоўваецца наперад такое важнае і актуальнае пытаньне, як перавод навучальных устаноў на непрарыўку.

В. П.

ЛАМАЕМ СТАРЫ БЫТ.

(м. Старобін, беларуская сямігодка, Бабруйскае акр.).

Старобінская беларуская сямігодка з 1-га кастрычніка перавяла сваю працу на бесперапынны тыдзень.

У Старобінскай сямігодцы 11 груп, а клясных пакояў усяго 6. Вось тут нам і ёсьць некаторы выхад. Для нулявой групы знойдзена асобнае памяшканьне, а астатнія разьмяркованы такім чынам: панядзелак — выхадны дзень для I і V-а груп, аўторак—для II і V-б груп, серада — для III і VI-а груп, чацьвер—для IV і VI-б груп, пятніца—для VII-а, нядзеля—для VII-б і 0 груп, субота—клюбны дзень.

Усіх настаўнікаў 12 чалавек, яны таксама маюць выхадныя дні ў розныя дні тыдню. Тэхнічныя працаўнікі (2 чал.) маюць выхадні дзень у суботу, бо для клюбнага дню ня трэба дзяжурыць і званіць,—патрэбнае абслугоўваньне ў клюбны дзень вядзецца дзяжурнымі вучнямі па школе. Дзелавод мае выхадны дзень у суботу, бібліятэкар—таксама ў суботу.

Крыху цяжэй з выхадным днём загадчыку, але і яму вызначаецца спэцыяльны дзень, калі яго замяшчае намесьнік.

Мы тут выйграваем, па-першае, што ў другую зьмену ідуць толькі дзьве групы, а трэцяя пачынае заняткі з паловы першай і канчае да 4 гадзін, па-другое, у нас няма аднаго дню адпачынку і гэтым мы б'ём па старым быце, па-трэцяе, настаўнікі могуць плянава скарыстоўвацца для грамадзкай працы.

Пакуль што мы перайшлі на сямідзёнку, але зараз мы распрацоўваем пытаньне аб пераводзе працы на шасьціднёўку, якая паслужыць пераходнай ступеньню і да пяціднёўкі.

Ц. Бародзіч.

ПЯЦІДНЁЎКА ВЫРУЧЫЛА.

(Талачынская сямігодка, Аршанскай акругі).

Талочынская сямігодка з 1 кастрычніка перайшла на бесперапынны тыдзень і ўкладае сваю працу ў 5-ці днёўку.

Раней школа ня ведала, што рабіць. Цэлы дзень і вечар школа была запружана настаўнікамі і вучнямі. Днём працуе адна зьмена, а ўвечары другая. Зараз, калі мы ўвялі пяціднёўку, школа працуе толькі днём, а вечар як у настаўнікаў, так і ў вучняў вольны. Гэта надта спрыяе грамадзкай працы. Настаўнікі сваіх вольных дзён ня трацяць, толькі выходныя дні яны маюць ня ўсе разам, а па чарзе.

Хв. Шпак.

Школы—на дапамогу калгаснаму будаўніцтву.

Пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі бядняцка-серадняцкія масы ў нашай краіне перабудоўваюць сельскую гаспадарку на новы, сацыялістычны лад, пераходзяць да машыновае апрацоўкі глебы. У буйных калектывах пашыраецца засеў тэхнічных расьлін. Паляпшаецца жывёлагадоўля. Наладжваюцца новыя формы калектыўнага жыцьця і быту. Будуецца новая культурная вёска. Але не з аднолькавым тэмпам. Адны раёны дасягнулі ўжо значных посьпехаў, абагуліўшы да 30 проц. пасеўнай плошчы, а ў другіх разьвіт яшчэ слаба калгасны рух. Гэты рух трэба ўзмацніць, пашырыць і паглыбіць. Гэта робяць мясцовыя партыйныя і грамадзкія арганізацыі, гэтай справе значна дапамагае наш друк, шэфства рабочых і г. д.

Але яшчэ недастатковую ўвагу гэтай справе аддаюць нашы школы. Вучні многіх школ ня ведаюць па справе што такое калгас і як там будуецца новае жыцьцё. Зусім рэдка праводзяцца экскурсіі ў буйныя калектыўныя гаспадаркі, сувязь з імі слабая. Зусім слаба яшчэ дапамагаюць школы наладжаньню культурнага жыцьця ў калгасах.

У сучасны момант нашы школы ўсіх тыпаў павінны паставіць сваёй непасрэднай задачай самы актыўны ўдзел у калгасным будаўніцтве. Якая канкрэтна пасільная праца можа быць праведзена школамі ў даны момант у справе дапамогі будаўніцтву калгасаў?

Школы ў першую чаргу павінны самі грунтоўна азнаёміцца з пастановамі XVI партканфэрэнцыі УсеКП(б) і XII зьезду КП(б)Б, з пастановамі нашага ўраду аб пяцігадовым пляне разьвіцьця народнае гаспадаркі наогул і сельскае гаспадаркі ў прыватнасьці і папулярызаваць гэтыя пастановы сярод бядняцка-серадняцкіх мас вёскі, паказаўшы неабходнасьць калектывізацыі дробных сялянскіх гаспадарак, як адзінага шляху разьвіцьця нашае сельскае гаспадаркі. Школы павінны арганізаваць і правесьці з сялянамі-беднякамі і сераднякамі шэраг экскурсій у найбольш буйныя і найлепш арганізаваныя калгасы, дзе неабходна пазнаёміць з арганізацыяй жыцьця і працы ў калгасах, паказаць перавагу калгасаў у тэхніцы апрацоўкі глебы, у разьвіцьці розных галін сельскае гаспадаркі (жывёлагадоўля, гародніцтва, садоўніцтва і інш).

Школы разам з мясцовымі ячэйкамі КСМ павінны выявіць вясковы актыў з бядняцка-серадняцкай масы вёскі, каб супольнымі сіламі падштурхнуць калгасны рух ў сваім сельсавеце, раёне.

У існуючых ужо калгасах школы павінны ўзяцца за ліквідацыю няпісьменнасьці сярод калгасьнікаў ў першую чаргу. Ліквідацыя няпісьменнасьці ў калгасах—першая і неадкладная задача. Арганізацыя розных гурткоў, арганізацыя бібліатэк, выпіска газэт, часопісаў і чытаньне іх, пастаноўка дакладаў аб дасягненьнях аграноміі, па санітарыі і гігіене, арганізацыя культурнага адпачынку для калгасьнікаў—вось шляхі культурнай працы школ у калгасах.

Вялікае значэньне ў калгасах мае пытаньне дашкольнага выхаваньня—арганізацыі дзіцячых ясьляў, пляцовак, дзіцячых садоў.

Школы ў гэтым напрамку могуць шмат дапамагчы ў парадку сваёй грамадзка-карыснай працы.

Вясковыя школы павінны будаваць ўсю сваю працу на вёсцы выходзячы перш за ўсё з задач калектывізацыі вёскі, з задач дапамогі калгаснаму будаўніцтву.

В. С.

Фэльетон

Бывае, хоць рэдка, але бывае...

Крылоўскі манах у свой час лічыўся хітрэй ад самага д'ябла толькі таму, што прымайстраваўся на сьвечцы, без патэльні сьпячы яйцо.

Быў час, што і такое здарэньне лічылася праявай, але гэта было даўно. Цяпер гэта ўжо не навіна, цяпер яйцо смажаць на вугольлі, нават на электрычнасьці, а калі на іншага лысага нагоняць жаху, дык у яго яйцо можа сьпячыся нават запазухай.

Перад вайною я ведаў настаўніка, які на вэлёсыпэдзе прыехаў у госьці да суседкі настаўніцы, а з тэй прычыны, што для храбрасьці на дарогу „храпнуў", рашыў перад сялянамі, што сабраліся пагледзець самакатку, прадэманстраваць свае здольнасьці і праехацца на сваей машыне па бэльцы ў хляве. Попыт ня ўдаўся—герой з самакаткай з бэлькі зваліўся на жэрдзе, зламаў раму самакаткі і ўсе сьпіцы з калёс, а сам недалічыўся небарака толькі трох уласных рабрын.

Сяляне надта зьдзівіліся здарэньню, ківалі моўчкі галовамі і казалі: „Бывае, хоць рэдка, але бывае і ў вучонай галаве заскок здараецца не на патрэбнай зарубіне".

У наш час у сэнсе сьмякалкі некаторыя з настаўнікаў зайшлі шмат далей.

У горадзе Менску, сталіцы Беларусі, ёсьць школа сацвыху № 8. Школа—як школа—мае вучняў-дзяцей працоўных, служачых і, ма быць, „іншых", мае настаўнікаў і нават парную адміністрацыю.

Дзеці перад лекцыямі, у часе перамен і пасьля лекцый дурэюць, бегаюць, навучаюцца ў інтэрнацыянальным, клясавым і антырэлігійным напрамку.

Усе, як быццам, таксама, як і ў іншых менскіх школах, але з маленькім «але». Гэтым „але" было тое, што вучні на паверхі школьнага будынку ўзьбіраліся па сходах, а спускаліся на дол на мяккіх сваіх частках на парэнчы, якая з правага боку агібае сходы на верх. Адміністрацыя школы парашыла выкарчаваць жалезам з вучняў шкодлае „але" і ўзялася за мазгі. Доўга думалі і ўрэшце рашылі. Ня ведаю, дзе трэ было-б зарэгістраваць вынаходства і каму іменна з адміністрацыі 8 школы выдаць мэдаль, калі не мэталёвую дык х о ц ь з рэдзькі, бо вынаходства аказалася радыкальным і дапамагло адразу. «Ня толькі ніводзін вучань ня стаў больш коўзацца па парэнчы, але ўсе дзеці сталі яе абыходзіць за паўмілі.

Што-б, вы думалі, разумнае прыдумывалі адміністратары з 8 сав. школы? Ды зусім проста—яны набілі ў парэнчу густа цьвікоў вайстрыём дагары, і той з дзяцей, хто садзіўся на парэнчу, дык ужо ня коўзаўся на дол, а затрымліваўся на месцы, рваў адзежу, уласную скуру, але адвыкаў і больш яго на парэнчу і сабакамі не загоніш.

Рабочыя, вучні школы дарослых, якія займаюцца ў гэтым памяшканьні па вечарох, таксама калечылі рукі, рвалі адзежу і зарэгістравалі „вынаходцтва" ў акруговага інспэктара асьветы т. Ярмакова, які ацаніў вынаходніцтва адміністрацыі 8 школы па свойму і загадаў разумным адміністратарам хоць зубамі, але навыдзіраць з парэнчы ўсе цьвікі і пазбавіць дзяцей і дарослых ад калецтва і псоты адзежы.

Адміністрацыя 8 школы, варочаючыся ад т. Ярмакова дамоў, ніяк не разумела, чаму гэта інспэктар не ўразумеў каштоўнасьці вынаходства, тым больш, што яны, упэўніўшыся на справе ў карыснасьці вынаходства ў сябе, нават параілі ўжыць гэта самае і адміністрацыі школы № 7.

Яны ішлі да хаты і сам-на-сам разважалі:

„Бывае, хоць рэдка, але бывае"...

З.

РАЦЫЯНАЛЬНА СКАРЫСТАЕМ ЧАС.

(Мсьціслаўскі пэдагагічны тэхнікум).

павялічваючы штатаў ні пэдагага, ні абслугоўваючага пэрсаналу, слаўскі пэдтэхнікум з 1-га кас...іка перайшоў на бесперапынны ...нь.

...куючы пераходу на бесперапын...ыдзень тэхнікуму і школы пры эдагагічныя 2-хгадовыя курсы з цю курсамі з вячэрняй зьмены ішлі на дзённую. Партыйныя і розныя іншыя сходы, якія дзяцца аб'яднана з пэдагагічнымі курсамі, працуючымі ўвечары, будуць зараз пачынацца своечасова а 5-6 гадзіне, а не зацягвацца, як раней, з 9 да 11-12 г.

Да таго-ж штодзённы адпачынак забясьпечыць бесперабойнасьць працы ў падшэфным сельсавеце, у якім па пляну сацыялістычнага спаборніцтва да 1-га кастрычніка 1930 г. павінна быць праведзена калектывізацыя на 100 проц.

В. Серафімаў.

Голай агітацыяй ...ы абмежавацца ня можам

...пытаньня: Ці патрэбны с-г. фэрмы пры пэдтэхнікумах.

...таньне аб ліквідацыі с-г. фэрм пэдтэхнікуме, узьнятае т. Серафі...(„Сав. Бел". 10-X № 232), ...гоўвае ўвагі.

праў, калі даводзіць, што фэр... фэрма сельска-гаспадарчага ...тыкуму, не здавальняе сучасных ...рабаваньняў жыцьця. Ён праў у вывадзе аб неабходнасьці правя...ня практыкуму ў камунах і кал... але ён вельмі мыляецца, калі ...ць у фэрмах сталыпінскую ўста...

...рш за ўсё тут непасрэдны гаспа...я кулак, а калектыў (тэхнікум), вядзе не індывід, а калектыў ...энты), мэта працы — не пагоня ...жывай, а практычная вучоба зьвя... з разумным выкарыстаньнем пры... на грунце дасягненьняў агра...

...маецца, што сталыпінскай ўста... ня мае і фэрма Мсьціслаўскага ...хнікуму, ад імя якога выступае

...б выступіць у ролі здольнага ар...атара, умелага правадніка лініі ...ні ў галіне падняцьця ўраджай...ці і калектывізацыі вёскі, неаб... дзе-небудзь хоць-бы мінімум на...ных практычных ведаў і звычак. ...лічу, што гэтага мы лепш за ўсё ...нём у сваёй **належна прыстаснай, належна арганізаванай ...ме.**

...арыстоўваць для гэтай мэты ка... або арцель,—значыць, парушыць ...творчы плян, значыць, не пазба... тых ці іншых перабояў у пра...якія заўсёды магчымы пры адсут...ці належнага вопыту.

...накіроўваць студэнтаў у якасьці ...айнай рабочай сілы—ня ёсьць ... задача.

... кожным разе справа не ў скаса...і фэрмы—яна патрэбна. Справа ...м, што часта практыкумам на ...е мы падмяняем неабходны і важ...ельгаспрактыкум на арэне жыцьця. ... ведаю выпадкі, калі арганізатар ...ян вучэбнай працы ўносіць на...аваньне марксыцкага аналізу га...ым чынам таму, што аб гэтым ця... усе кажуць. Ёсьць факты, калі ...ўнік, седзячы да 2-х гадзін ночы ...увязкай граматычнага правіла на ...» і „чык" (лісточак, пальчык) з комплекснай тэмай думае, што ім ужо ўсё зроблена ў справе комплекснай сыстэмы. Таксама праводзячы грунтоўную тэорэтычную і практычную працу на фэрме, мы часта супакойваем сябе тым, што заслухаем у канцы году адпаведны справаздачны даклад і вынесем адпаведную «здавальняючую» рэзалюцыю.

А дзе-ж наш удзел у акаляючым жыцьці, якое б'е крыніцай? Дзе дапамога камунам, арцелям, прапаганда паказам, а ня толькі расказам дырэктыў партыі, апошніх дасягненьняў аграноміі? Адным чынам, дзе фэрма, **як фактар будаўніцтва жыцьця?**

Прынамсі ў практыцы Рагачэўскага белпэдтэхнікуму такая вылазка ў жыцьцё мае месца, але яна носіць слоўна-агітатарскі характар.

Партыя, савецкая ўлада і ўся савецкая грамадзкасьць вымагаюць большага. Закласьці паказальны гарод поле, пітомнік, пасеку, палепшыць хоцьбы невялікі кавалак лугу, дапамагчы ў падняцьці жывёлагадоўлі, у лепшай рацыяналізацыі сельска - гаспадарчай прадукцыі, — усё гэта надзвычайна ўдзячная праца ў справе паглыбленьня ведаў і навыкаў, у справе выхаваньня актыўных, сьвядомых будаўнікоў новага жыцьця, сапраўдных чырвоных настаўнікаў.

Для гэтай мэты неабходна, у першую чаргу, узмацніць настаноўку агрыкультурна сваёй фэрмы, лепш яе абсталяваць і рацыяналізаваць, пераглядзець існуючы вучэбны плян з тым, **каб сельска-гаспадарчых дысцыпліны і тэорытычна і практычна прапрацаваць на I і II курсе. III курс вядзе агропрацу ў камунах, арцелях, у падшэфных вёсках і іншае, а IV курс—аграпэдпрацу і выбірае сваім аб'ектам пераважна школы з іх зямельнымі вучасткамі.**

Такая пастаноўка будзе, па маёй думцы, найлепш адпавядаць запатрабаваньням сучаснасьці, і толькі ў гэтым напрамку неабходна весьці абгаварэньне тых перашкод, якія могуць сустрэцца па гэтым шляху, а ня ставіць рубам пытаньне аб скасаваньні фэрмы.

А. Харэвіч.

г. Рагачоў.

Дапамажэце дабудаваць.

(Чырвонапольскі раён, Магіл. акр.).

...вёску Ўсьцінавічы сёлета пры... маладога, шчыра-адданага сваёй ...ве настаўніка-камсамольца.

...алады настаўнік надзвычайна за...ўся працаю ў школе. Ён ужо ... пры школе гурткі—фізкультур... харавы, а таксама піянэрскі ...д.

...е паставіць працу як належыць ...ае цесната.

Сяляне гэтае вёскі яшчэ ў 1923 г. распачалі будаваць даволі добрае памяшканьне пад школу. Але скончыць не давялося—не хапіла сродкаў.

Колькі ні хадайнічалі перад райвыканкомам—нічога ня выходзіць. Так і стаіць пустой стадолай незакончаная школа. Чаму інспэктарыят нарасьветы не клапоціцца, каб дабудаваць школу?

Л-ны.

4.169.000 руб. на новыя будынкі для навучальных устаноў

У 1929-30 годзе ў БССР мяркуецца пабудаваць шэраг новых будынкаў для розных навучальных устаноў.

У Менску будзе будавацца новы будынак для менскага палітэхнікуму, што выклікаецца як пэрспэктывамі адчыненьня шэрагу новых аддзяленьняў, так і значным павялічэньнем колькасьці студэнтаў. Апрача таго, для палітэхнікуму мяркуецца пабудаваць інтэрнат на 500-700 студэнтаў.

Сёлета ў Менску адчыніўся дашкольны тэхнікум, якому прыходзіцца весьці заняткі ў будынку польскага пэдтэхнікуму. Мяркуецца для дашкольнага тэхнікуму пабудаваць спэцыяльны будынак. Мяркуецца таксама пабудаваць інтэрнат для студэнтаў хіміка-тэхналёгічнага факультэту БДУ прыкладна чалавек на 400.

У Віцебску будзе будавацца будынак для інтэрнату студэнтаў кааперацыйнага і мастацкага тэхнікумаў арыентыровачна на 150 чалавек. Будзе павялічана жыльлёвая плошча Віцебскага рабфаку спосабам пабудовы 3-га паверху над існуючым будынкам.

У Мазыры будзе пабудаван інтэрнат для Беларускага Пэдтэхнікуму на 100 чал., у Полацку—спэцыяльны будынак для прафшколы агнітрывалага будаўніцтва і ў Гомелі—для хімічнай прафшколы. У Горках для Сельска-Гаспадарчай Акадэміі будзе будавацца галоўны вучэбны корпус прыблізна ў 30-35 тысяч кубамэтраў і, апрача таго, інтэрнат—на 700 чал.

Наркамасьветы даў распараджэньне ўсім адпаведным навучальным установам супольна з акруговымі інспэктарамі нарасьветы распачаць падрыхтоўку праграм будаўніцтва і своечасова дабіцца водпуску належных зямельных вучасткаў.

На сканчэньне будаўніцтва унівэрсытэцкага гарадка, клінік, дзяржаўнай бібліатэкі і ўсё пералічанае вышэй будаўніцтва ў бягучым гаспадарчым годзе будзе затрачана 4169 тыс. руб.

Распрацоўка праэктаў па пералічаным вышэй будаўніцтве будзе праводзіцца адпаведнымі праэктнымі бюро пры будаўнічых арганізацыях, якія будуць ажыцьцяўляць будаўніцтва.

Наркамасьветы прыняў рашэньне выдаць спэцыяльны альбом усіх тыповых будынкаў для школьнага будаўніцтва і распрацаваць тыповыя праэкты хат-чытален і нардамоў.

За палітэхнічную асьвету.

(Пра 20-ю менскую фабрычна-заводзкую школу).

Даўно ўжо насьпела пытаньне ўвязкі элемэнтаў палітэхнікуму з масавай савецкай школай.

Весь чаму са здаваленьнем можна адзначыць факт ператварэньня 20-ай сямігадовай школы ў фабрычна - заводзкую.

Правёўшы вялізарную арганізацыйна-выхаваўчую працу ў мінулым навучальным годзе, яна з самага пачатку гэтага году ўзяла курс на завод, на працу вучня каля станка.

Увязка плянавая, канкрэтная. Вучань ня ідзе туды ў ролі экскурсанта, глядача, а прыходзіць становіцца за станок і пад кіраўніцтвам інструктара вучыцца працаваць, набывае вытворчую кваліфікацыю.

Завод „Энэргія" вельмі спагадна аднёсься да гэтай новай формы падрыхтоўкі маладога рабочага.

Цяпер на заводзе працуюць дзьве групы—6 і 7, а праз некаторы час будзе працаваць там і 8-ая, якая на гэтых днях адчыняецца.

Сваю грамадзка-карысную працу школа таксама ўвязвае з заводам.

У галіне грамадзка-карыснай працы школа выйшла далёка за межы сувязі толькі з заводам „Энэргія". Яна не забылася і пра нашу вёску. Школа дапамагла сялянскай беднаце в. Рыбцоў і суседніх арганізаваць калгас на 300 дзесяцінах, зараз вядзе работу па радыёфікацыі падшэфнай вёскі Заzer'е, падрыхтоўваючы 10 штук радыёпрыёмнікаў.

У школе арганізуецца сталярная майстэрня і картанажна-пераплётная.

Школай актыўна праводзіцца ліквідацыя няпісьменнасьці, разьвінута работа па дапамозе вучням-беднякам.

У школе шырока разгортваецца крытыка і самакрытыка ўсёй працы. Першы нумар пасьценнай газэты „Школьны Прамень", які вышаў пад лёзунгам: Усю работу пад агонь самакрытыкі", яскрава сьведчыць аб гэтым.

Правёўшы дзень у школе, адчуваеш, што тут вядзецца змаганьне за новага чалавека, блізкага да дзейнасьці працоўнай грамады.

В. Дуброва.

Чым тлумачыць Белдзяржвыдавецтва

СПАЗЬНЕНЬНЕ З ПАДРУЧНІКАМІ І ПРЫЛАДАМІ ДЛЯ ШКОЛ.

Падрыхтоўка да навучальнага году пачынаецца ў Выдавецтве ўвесну, пасьля таго, як канчаткова НКА зацьвердзіць рэкамэндацыйны сьпіс на падручнікі, а акругі вышлюць у БДВ свае заяўкі паводле гэтага сьпісу.

На працягу некалькіх год выдавецтва праводзіла выпуск падручнікаў у летні час з такім разьлікам, каб ў жніўні месяцы скончыць іх рассылку на месцы. Як правіла, штогодна заяўкі з месц позьніліся і частка іх дасылалася ў БДВ у чэрвені, у той час, як загрузка друкарні павінна была пачынацца не пазьней мая. Ня маючы ўсіх заявак, выдавецтва вызначыла тыражы падручнікаў на падставе заявак мінулага году, з пэўным процантам надбавак на тыраж для розьнічнага продажу. Гэта вымушанае „гаданьне" на тыражы пагражала або недахопам падручнікаў у самы разгар навучальнага сэзону, або вялікай затаваранасьцю, якая застаецца мёртвым капіталам на працягу цэлага году (пры зьмене праграм частка затаваранага тыражу давала чыстую страту).

Падручнікі для школ першага і часткова для другога канцэнтру штогодна друкуюцца з так званых стэрэотыпаў, г. зн. без затраты часу на набор, вёрстку, карэктуру і г. д. Калі ўсё ідзе нармальна, выпуск усіх стэрэотыпных падручнікаў адбываецца за тры месяцы. Некалькі год амаль усе падручнікі перадрукоўваліся бяз зьмен або з самымі нязначнымі папраўкамі. Некаторыя з іх лічыліся „стандартнымі" і вытрымалі 7-8 выданьняў.

Гэты год працы выдавецтва быў выключна цяжкім, асабліва ў галіне падручнікаў.

У сувязі з тым, што грунтоўна зьмяніліся праграмы, трэба было ўсе падручнікі перапрацаваць, каб яны былі прасякнуты момантамі індустрыялізацыі, калектывізацыі, антырэлігійнага і інтэрнацыянальнага выхаваньня. Шмат часу пашло на прагляд падручнікаў Навукова-Мэтадалёгічным Камітэтам, палітрэдакцыяй і на перапрацоўку аўтарамі. Яшчэ больш часу забраў новы набор усіх гэтых падручнікаў, вёрстка, карэктура, бо грунтоўная апрацоўка зьнішчыла магчымасьць друкаваць кнігі са стэрэотыпаў.

І вось уся тая праца друкарань, якая адбывалася ўлетку, у гэтым годзе згрудзілася на жнівень і верасень месяцы. Для друкарні з навейшым тэхнічным абсталяваньнем тэрмін у тры месяцы нават і немалы. Але нашы прадпрыёмствы—тэхнічна адсталыя, малапрадукцыйныя. Усё-ж-такі ў гэтыя апошнія месяцы друкарні БДВ далі такую колькасьць кніжнай прадукцыі, а якой у мінулым годзе нельга было і думаць.

Пераплётны цэх перавялі на „бесперарыўны паток", што павялічыла выпуск адных толькі падручнікаў да 7.000 экз. у дзень.

Сшыткаў канвэртная фабрыка давала і дае штодня да 40.000 штук. Спазьненьне і недахоп сшыткаў залежыць ад спозьненага і малога паступленьня пісчае паперы з Масквы. Паперы на сшыткі не хапае, таксама не хапае дроту на шытво сшыткаў і падручнікаў, бо норму сыравіны, якая патрэбна для БДВ, цэнтральныя рэгулюючыя органы зьнізілі ў сувязі з недахопам гэтай сыравіны ў саюзным маштабе.

Што выканана выдавецтвам па заказах з акруг?

Заказы на пісьмовыя прылады—чарпільны парашок, алоўкі, пёры, прамакацельную паперу—выкананы поўнасьцю для ўсіх школ на 1-Х.

Заказы на сшыткі ў колькасьці 1.300.000 экз. выкананы для школ поўнасьцю на 1-Х.

Для лікпунктаў—заказ на сшыткі ў колькасьці 1.200.000 экз. Яшчэ да гэтага часу не ад усіх райінспэктароў паступілі заяўкі на сшыткі. Па меры паступленьня з Масквы пісчай паперы, заказ выконваецца і на 1-XI будзе выканана 50 проц. заявак, а рэшта—да 15-XI.

Падручнікі для школ. Разасланы ўсе падручнікі, апроч чытанкі для другога году „Чырвоная Зьмена" (рукапіс якой паступіў у друк 13-VII з загадам у друкарню выпусьціць кнігу) і падручнікаў па геаграфіі—пытаньне аб геаграфіі было станоўча вырашана Мэтадкомам толькі ў чэрвені м-цы, пасьля чаго рукапісы былі заказаны і зараз яны знаходзяцца ў друку.

Лемантар для лікпунктаў. Увесну НКА даў заказ на 100.000 экз. лемантара. Увесь тыраж быў гатовы ў маі месяцы. Да 1 жніўня заявак паступіла на 47.000 экз. За жнівень м-ц паступіла заявак яшчэ на 65.000 экз., у верасьні—на 31.300 экз. і ў кастрычніку—на 4.200 экз.

У верасьні м-цы выдавецтва тэрмінова яшчэ надрукавала 50.000 экз., якія гэтымі днямі будуць разасланы.

Як тут плянава працаваць, калі заяўкі з месц прыходзяць яшчэ ў кастрычніку, у той час, як усе яны павінны быць у выдавецтве не пазьней канца мая.

Калі выдавецтва запэўняла НКА, што лікпункты забясьпечаны падручнікамі поўнасьцю, яно мела на ўвазе, што заяўку НКА на 100.000 экз. лемантара яно выканала яшчэ задоўга да пачатку навучальнага году.

І. Шыпіла.

АД РЭДАКЦЫІ:

Адказ загадчыка БДВ тав. Шыпілы І. на артыкул „ХТО ПАКІНУЎ ШКОЛЫ БЕЗ ПАДРУЧНІКАЎ І ПРЫЛАДАЎ" („Сав. Бел." № 232, за 10 X г. г.) і на шэраг іншых, якія былі зьмешчаны ў кожнай газэце і сыгналізавалі аб небясьпецы ў справе забясьпечаньня школ і лікпунктаў падручнікамі і прыладамі,—мае некаторую тэндэнцыю скінуць усю віну на НКА і на папяровы крызіс. Аднак, у канцы жніўня БДВ магло ўжо на падставе стыхійнай плыні заявак з месц улічыць, што заказ у 100.000 экз. на лемантары для лікпунктаў ня можа задаволіць сапраўднай патрэбы месц. Па-другое, БДВ павінна было ўлічыць, што плян ліквідацыі няпісьменнасьці прадугледжвае зьнішчэньне няпісьменнасьці сярод 250.000 чалавек, якім патрэбны будуць падручнікі. Па-трэцяе, на якой падставе прадстаўнік БДВ на калегіі НКА 24-га жніўня заявіў, што падручнікамі школы будуць поўнасьцю забясьпечаны да пачатку навучальнага году, калі чытанка „Чырвоная Зьмена" і гэографія не маглі выйсьці з друку своечасова? Органы НКА, безумоўна, вінаваты ў спазьненьні з падручнікамі і прыладамі, але значная доля віны кладзецца і на БДВ.

За растрату грамадзкіх сродкаў.

У мінулым годзе, як вядома, былі вялікія маразы.

В у ч н і Вялікасельскай школы, Заслаўскага раёну, якія ня мелі цёплай вопраткі і абутку, перасталі наведваць школу.

Траскоўскі сельсавет і камітэт сялянскай узаемадапамогі пастанавілі дапамагчы дзецям вучыцца і адпусьцілі 60 р. на набыцьцё абутку і вопраткі бяднейшым вучням.

Гэтыя грошы былі даручаны загадчыку Вялікасельскай школы **Івану Калантаю**, каб ён закупіў абутак і сякую-такую вопратку і разьмеркаваў сярод бедных вучняў школы.

Атрымаўшы 60 р., Калантай купіў, як кажуць, для віду на 10 р. вопраткі і даў яе 2 вучням, а рэшту, 50р., растраціў на свае патрэбы.

За гэта Калантай трапіў пад суд.

Народны суд Заслаўскага раёну прыгаварыў яго на адзін год зьняволеньня.

Д. Кастроў.

Загадчык сямігодкі—п'яніца.

(Вузьдзенскі р. Менскай акругі)

Загадчык Вузьдзенскай сямігодкі **Сакалоўскі**, член КП(б)Б, сыстэматычна займаўся п'янкамі, якія часам даходзілі да дзікасьці.

Сакалоўскі ладзіў вечарынкі з іншымі настаўнікамі з п'янкамі. П'янкі даходзілі да таго, што Сакалоўскі траціў вобраз чалавека. Наогул-жа ён напіваўся амаль што кожны дзень.

Для дастаўкі сабе рускай горкай ён скарыстоўваў кухарку інтарнату Грышук Марылю і яе дачку камсамолку. Прысутнічаў у якасьці госьця на рэлігійных хрэсьбінах тэхпрацаўніка, дзе таксама не прамінуў выпадку выпіць.

Часта п'яны Сакалоўскі зьяўляўся ў інтэрнат да дзяўчат. Тут ён разводзіў кампраметуючыя партыю гутаркі аб чыстцы партыі. Некалькі разоў Сакалоўскі злосна глушыў самакрытыку, асабліва крытыку яго працы.

З рэвальвэрам у руках ён спыняў на дарозе людзей, страляў уначы бяз усякай прычыны. Сакалоўскі груба, бесчалавечна стараўся мсьціць тым, хто пасьмее супроць яго сказаць слова.

Апроч гэтых фактаў было і яшчэ вельмі многа ганьбячага матар'ялу супроць Сакалоўскага. За ўсё гэта камісія па чыстцы партыі пастанавіла выключыць Сакалоўскага з шэрагаў партыі.

Трэба зьнішчыць ненармальнасьці.

Менскі Палітэхнікум да гэтага часу ня мае сталага дырэктара, ня мае шмат якіх выкладчыкаў. Да гэтага часу яшчэ ня скончан рамонт інтэрнатаў, хоць можна было скончыць месяц таму назад. Навучальны год на другім курсе зацягнуўся больш чым на паўмесяца—усё ўладжвалася пытаньне наконт выкладчыкаў,—але ёсьць яшчэ і цяпер перабоі ў занятках.

Для хэмічнага аддзяленьня яшчэ няма лябараторыі, няма агульных памяшканьняў, а тыя памяшканьні, якія ёсьць, перапоўнены больш чым на 200 процантаў.

У студэнцкай сталоўцы абедае больш 400 студэнтаў, а хутка прыедуць студэнты 3-га і 4-га курсаў—гэта складзе больш 700 студэнтаў. Да абслугоўваньня такой колькасьці людзей наша сталоўка не прыстасавана, бо цяпер і то прыходзіцца чакаць абеду гадзіны паўтары. А сьнеданьня і вячэры дык і зусім няма.

Палітэхнікум неадкладна трэба ўпарадкаваць.

Віньнікаў Зьм.

З лістоў.

— Пры хаце-чытальні ў вёсцы Путчына (Койданаўскі р., Мен. акр.) ёсьць драмгурток з вясковай моладзі. У х-чытальні цесната, і таму драмгурток зьвярнуўся з просьбай да заг. польскай школы сял. моладзі тав. Квапінскага, каб ён дазволіў паставіць спэктакль у клюбе школы. Але заг. Квапінскі дазволу не дае.

— Сёмкава-Гарадзецкая хата-чытальня (Менскай акр.) даўно ня мае хатніка. Хата-чытальня ня прымае ўдзелу ні ў якіх палітычных і гаспадарчых кампаніях і наогул не вядзе ніякай палітвыхаваўчай працы.

— Вёска Кацуры, Капаткевіцкага р., Мазырскай акр., у 1928 годзе купіла на сродкі самаабкладаньня хату гр. Гомана-Пэйсаха пад школу. Заплацілі 650 руб. Хату ўжо два разы рамантавалі, так што яна каштуе ўжо 921 руб. 32 кап. Але займацца ў ёй усё роўна нельга, бо гэта хата—адзін хлам. Патрэбна на рамонт яшчэ рублёў 300.

ЗАКОНЫ І ЗАГАДЫ ЎРАДУ БССР

Пастанова

Савету Народных Камісараў БССР

пра стаўкі на 1929-30 г. пэнсіі інвалідам вайны і сем'ям забітых на вайне.

Выходзячы з прадугледжанай кантрольнымі лічбамі на 1929-30 г. сумы пэнсійнага фонду ў разьмеры 1328 тыс. руб., Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Устанавіць на 1929-30 г. наступныя месячныя стаўкі пэнсіі інвалідам вайны і сем'ям забітых на вайне:

А. Інвалідам вайны:

Адзінокім:	Менск, Віцебск, Гомель.	Інш. акругов. гарады.	Інш. мястэчкі.
1 група	27	25	22
2 "	19	17	15
3 "	12	11	10
Сямейным:			
1 група:			
З 1 непрацазд. утрым.	27	25	22
" 2 " "	29	27	23
" 3 і больш "	31	29	24
2 група:			
З 1 непрацазд. утрым.	20	18	15
" 2 " "	22	20	16
" 3 і больш "	24	22	17
3 група:			
З 1 непрацазд. утрым.	15	14	12
" 2 " "	17	16	13
" 3 і больш "	19	18	14
Б. Сем'ям забітых:			
З 1 членам сям'і	9	7	6
" 2 " "	13	12	11
" 3 і больш "	19	17	15

2. Інвалідам вайны, у сем'ях якіх няма непрацаздольных членаў сям'і, раўняюцца да адзінокіх.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР **М. Галадзед.**

Нам. Кіраўніка Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнае Нарады БССР **Л. Дубавіцкі.**

16 кастрычніка 1929 г.
Гор. Менск.

„ГЛУХІ“ Ў ДЗЯРЖАЎНЫМ ЯЎРЭЙСКІМ ТЭАТРЫ БССР.

Гэта сацыяльная трагэдыя, якая складаецца з дзьвюх генэтычных разнастайных тэм. Моцная па сваёй арыгінальнасьці фігура глухога, як паказальнік прыгнечанасьці рабочых, як выявіцель клясавай глухаты пралетарыяту, і грашовая магутнасьць Быкоў, магутнасьць гандлёвай і прамысловай буржуазеі. Гэтая вострая сацыяльная тэма аднасіцца да таго часу, калі пралетарыят быў яшчэ клясай у сабе.

Яна настолькі цікава вырашана, што набліжаецца шчыльна да сучаснасьці.

І побач з гэтым ужываецца ў п'есе заплесьнелая ад старасьці вечная тэма аб трагэдыі работніцы, ашуканай гаспадарскім сынком. Тэма, якая займае вялізарнае месца ў п'есе, якая прэтэндуе на сацыяльнае месца ў ёй (работніца—дачка глухога) ніколькі не дэфарміравана. Яна ўзята цалкам так, якою яе можна сустрэць у кожнай сьлязьлівай амэрыканскай драме.

Гэта зьніжае, блязуноўна, высокую каштоўнасьць п'есы Бэргельсона.

Пераробка з апавесьці зрабіла няявыразным жанравы твар «глухога». Тут засталося яшчэ шмат ад апавяданьня.

Дзея ёсьць тут толькі ў дыялёгу і хутчэй усяго ў маналёгу. Тут амаль нічога ня робяць, а аб усім апавядаюць. Апавядаюць амаль усе пэрсанажы. Дамінуючым словам у дыялёгу выяўляецца слова «гаворань».

Такая апавядальнасьць стварае маналёг і ня можа зрабіцца дынамічным рухавіком п'есы.

Вялікае зацягваньне, паўтарэньні адных і тых-жа сюжэтных месц, агульная павольнасьць падзей—усё гэта стварае статыку. Гэта падтрымліваецца перахожымі сцэнамі (статычнасьць унізе і дзея наверсе), якія робяцца на працягу першае паловы спэктаклю пагражаючымі сваёй пэрманэнтнасьцю. Такая доўгая статычнасьць сцэн прыводзіць нязьменна да позы. Ня проста да позы, як псыхалёгічна апраўданаму выявіцелю дзеі, а, што куды горш, да позы для фатаграфіі. Тут няма скульптурнасьці нават, бо няма заданасьці і разам з тым ніякага апраўданьня прыёму «застываньня». Бястэмнае „застываньне“ выкрывае прыём для прыёму, адчуваецца прыцягнутым за вушы ўмоўнасьцю. Нікчэмнасьць гэтага прыёму выкрывае дасканалая апрацоўка другой паловы другога акту, у якой статычнасьць пераходзіць у дынаміку—шляхам тэматычнай пераклічкі вышэйшага паверху з ніжэйшым.

Павялічэньне гэтай статычнасьці прывяло рэжысуру да памылкі. Дакладнасьць і кампактнасьць усіх ужытых сродкаў у пастаноўцы зрываецца на непасьлядоўнасьці аднэй тэатральнай умоўнасьці. Можна зазначыць на простую памылку ў гэтым сэнсе; у той час, калі глядач даведваецца з першых сцэн, што з вышэйшага паверху добра чуваць у ніжэйшым, у наступных сцэнах выкрываецца нячуваная рэч. Мадам Бык паведамляе свайму мужу, які знаходзіцца на першым паверсе, аб тым, што гарыць млын, а ўнізе некалькі хвілін працягваецца найбольш наіўная „жывая карціна“. Бык і мучнікі замяшаліся. Ня кажучы аб несцэнічнасьці данага прыёму, трэба зазначыць на тое, што выбар якой-небудзь тэатральнай умоўнасьці неабходна прызначае прынцыпіяльнасьць гэтага прыёму. Г. зн., што выбраная раз умоўнасьць павінна быць вытрымана да канца п'есы. Бо інакш бяспрынцыпна парушаюцца законы тэатральнай тэхнікі.

Ня гледзячы на асобныя недахопы, агульны малюнак пастаноўкі застаецца выразным і значным.

Дасканалая сыгранасьць ансамблю падначальвае ўсё адзінаму замыслу. Тут артыст ня грае толькі для таго, каб выявіць сябе; ён часта выходзіць са сцэны, каб уступіць месца другому.

Маса рытмічных месц даказвае сыгранасьць музыкі з харэаграфіяй, і ўсё гэта разам з сьветавымі тонамі і фарбамі выяўляе асноўны замысел, выяўляе яго ў імпрэсіёністычным пляне. Імпрэсіёнізм тут ва ўсім: у павольнасьці падзей, у апавядальнасьці, у акцэнтыроўцы і паўтарэньні асобных мас, у агульнай статычнасьці, у мяккасьці сьветавых і маляўнічых тонаў. Гэта пакідае ўражаньне далёкай глухасьці ва ўсім спэктаклю, якая выяўляе імпрэсіёністычную тэму. Глухата старога — якасьць далёкая ад абагуленьня, глыбока індывідуальная, імпрэсыўная. Сацыяльнасьць гэтай індывідуальнай уласьцівасьці ажыцьцёўлена яскрава. У гэтым трэба аддаць належнае пастаноўшчыку. Усё вядзецца да выяўленьня сацыяльнасьці, да сутычкі клясаў, у гэтым моц замыслу.

Прыёмы, якія выяўляюць замысел, самі па сабе мала арыгінальны. Але галоўнае гэта ў скрыжаваньні гэтых прыёмаў, якое надае ім вельмі цікавую і арыгінальную сэнсоўнасьць. Так, напр., рэлігійная працэсія сама па сабе нічога новага не выяўляе, але рэлігійная працэсія на фоне заслоны, дзе мы бачым быка ў абрадных атрыбутах, гэта дасканала. Тут ня толькі процілеглясьць. Тут парадыйнасьць. Тое-ж самае ў гандлі, які адбываецца ў часе малітвы, ці ў пахабнай сцэнцы, якая перапыняе рэлігійны абрад.

Тая-ж думка выяўлена мастаком у заслоне. Самы факт быка ў сінагогальным убраньні—экспрэсыўны, але ажыцьцёўлен імпрэсіяністычнымі сродкамі: мяккасьцю фарбаў, паступовасьцю іх пераходаў. Невялікае тулава малюе ціхага ад прыроды быка, які прышоў у экстаз з прычыны «сьвята». Гэта ўпартая тупасьць, а не крыклівае невуцтва.

Дасканалая музыка таксама не ўключае ў сябе бурнасьці. Гэта ціхія дэфарміраваныя народныя матывы, цікава пераблытаныя з сюжэтнай лініяй п'есы.

Бездакорная рэжысура робіць з артыстаў тое, што робіць уся старая злучнасьць сродкаў, ужытых у спэктаклі на шляху да ажыцьцяўленьня замыслу.

Цорфасу ўдалося стварыць зусім новы, складаны псыхалёгічны вобраз. У ім тупасьць глухога старога мастацкі пераблытваецца са страшэннай нянавісьцю да свайго прыгнятальніка. І ўсё гэта паступова перарастае ў нястрыманае пачуцьцё помсты. Фон глухаты робіцца ўвасабленьнем клясавай глухаты пралетарыяту, якая штурхае старога на падпал, які пазбавіць забастоўшчыкаў апошняга кавалка хлеба.

Вельмі добра вядзе Цынкіна ролю мадам Бык. Гэта эканомны і фальшывы мозаг капіталізму.

Герман месцамі зрываецца з тону, набываючы старчаскія інтанацыі глухога.

Бык павінен быць грубой бычай фігурай у поўным сэнсе гэтага слова (не дарма ў яго такое выдатнае прозьвішча), яго так сабе і малюе глядач і ўжо ніякім чынам не чакае ад яго ні мяккага тону, ні ціхага голасу. Ён ня можа і не павінен быць лісьлівым. Быкі ідуць напралом. Гэткая іх сацыяльная сутнасьць. А Герман, зрабіўшы крывую лінію, парушыў суцэльнасьць намечанага ім удалага вобразу.

Цяжка гаворыць аб працы Арончык у ролі Эстэр, г. зн. яе тэкстуальны матар'ял настолькі запошаны, што няминуча павінен адбіцца на ігры артысткі.

Суровасьць мэтаду і адначасова шырыня мастацкага маштабу ўсяе пастаноўкі набліжае спэктакль да манумэнтальнасьці. Але да манумэнтальнасьці недасяжнай масаваму гледачу. Не дасяжна яна таму, што над імпрэсыўнасьцю спэктаклю навіс нейкі „роў“, праўда «роў» сацыяльнасьці, але вырашаны сымбалічна (глухі, які замахнуўся сякерай на Быка). Вось чаму спэктакль гэты дойдзе да вельмі пісьменнага гледача, які здолее знайсьці выхад з «злавеснага рову».

С. Лендаў.

У Савеце Народных Камісараў БССР.

На апошнім чарговым пасяджэньні Савету Народных Камісараў пад старшынствам тав. М. М. Карцліна былі разгледжаны наступныя пытаньні.

МЕРАПРЫЁМСТВЫ ПА БОЛЬШ ШЫРОКІМ УЦЯГНЕНЬНІ Ў С.-Г. ЭКСПЛЁАТАЦЫЮ ЗАБАЛОЧАНЫХ ЗЯМЕЛЬ І ПАВЯЛІЧЭНЬНІ ЎКЛАДАНЬНЯЎ СРОДКАЎ НАСЕЛЬНІЦТВА Ў МЭЛІАРАЦЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА.

З мэтаю больш шырокага ўцягненьня ў сельска-гаспадарчую эксплёатацыю забалочаных і нявыгадных зямель, стварэньня спрыяючых умоў для пашырэньня сацыялістычнага сэктару сельскай гаспадаркі, а таксама для павялічэньня ўкладаньняў сродкаў насельніцтва ў мэліярацыйнае будаўніцтва, СНК прыняў пастанову, якою прадугледжваецца шэраг мерапрыёмстваў у гэтай галіне.

Згодна гэтай пастановы, павінен і надалей праводзіцца жорстка прынцып канцэнтрацыі мэліярацыйных і каленізацыйных работ па басэйнах рэк і буйных магістральных каналаў, забясьпечваючы адначасова і поўную дапамогу насельніцтву ў яго работах на вучастках, адарваных ад буйных балотных масываў. Праэкты работ і плян скарыстаньня асушаных плошчаў павінны складацца на падставе дэталёвых поўных вышуканьняў і павінны максымальна забясьпечваць разьвіцьцё сельскай гаспадаркі, прамысловасьці, рыбнае і ляснае гаспадаркі раёну работ, пры гэтым мэліярацыя данага раёну, калі яна ўносіць значныя зьмены ў гаспадарку раёну, павінна быць пастаўлена ў падставу рэканструкцыі сельскай гаспадаркі ўсяго раёну.

У зьвязку з перадачаю Калгассаюзу мэліярацыйных таварыстваў яму перадаецца шэраг мэліярацыйных работ, якія зараз праводзяцца НКЗемам і яго мясцовымі органамі, як: правядзеньне дробнай асушальнай сеткі на балотах мэліярацыйных таварыстваў, правядзеньне вышуканьняў па гідратэхніцы на дробных балотных масывах, складаньне плянаў па культуртэхніцы і г. д.

Каб зьнішчыць паралелізм у рабоце мэліярацыйных і торфавых таварыстваў па асваеньню асушаных плошчаў, мэліярацыйным таварыствам даецца права займацца здабычаю торфу на апал і ўгнаеньне, а торфавым таварыствам—займацца мэліярацыяй і культурай балот.

Для забясьпечаньня калектыўнай асушкі і эксплёатацыі асушаных балот таварыствамі, а таксама для пераходу іх у вышэйшыя віды калгасаў, НКЗему і Белкалгассаюзу даручана праводзіць землеўпарадкаваньне ўсёй зямельнай плошчы таварыства. Асушаныя плошчы павінны лічыцца землямі калектыўнага карыстаньня таварыства, недапушчаючы падзелу іх на вучасткі для паасобных членаў таварыства.

З мэтаю пашырэньня механізацыі і росту тэмпу мэліярацыйных работ ВСНГ даручана прыступіць з 1929-30 г. да вырабу найбольш простых машын (балотных плугоў, барон і інш.), што датычыцца больш складаных машын (землячарпалак, гусенічных трактараў), то НК Зем. павінен вызначыць патрэбны тып гэтых машын і паставіць перад саюзнымі органамі пытаньне аб вырабе гэтых машын на заводах СССР.

Прызнана неабходным увесьці з бягучага году прэміраваньне працаўнікоў па мэліярацыі і торфу за колькасьць і якасьць выкананай імі работы, а таксама практыкаваць больш шырэй камандыроўкі за межы БССР працаўнікоў—спэцыялістаў па мэліярацыі і торфу для падвышэньня іх кваліфікацыі.

Адзначаючы, што дасягненьні мэліярацыйнага будаўніцтва БССР мала вядомы шырокай грамадзкасьці як у БССР, так і па-за межамі яе, СНК даручыў НКЗему, Навукова-Дасьледчаму Інстытуту імя Леніна і Белдзяржвыдавецтву шырока практыкаваць выданьне матар'ялаў і нікаў мэліярацыйнага будаўніцтва БССР, шырока асьвятляць іх у перыядычным друку, а таксама практыкаваць экскурсіі сялян на буйныя мэліярацыйныя работы і гаспадаркі на балотах і практыкаваць кіно-здымкі як дзяржаўных мэліярацыйных работ, так і мэліярацыйных работ, якія праводзяцца насельніцтвам.

ПРА ІНДЫВІДУАЛЬНАЕ АБКЛАДАНЬНЕ С.-Г. ПАДАТКАМ.

СНК заслухаў даклад НКФ пра індывідуальнае абкладаньне с.-г. падаткам.

Савет Народных Камісараў адзначыў, што ўсе акруговыя выканаўчыя камітэты, асабліва Гомельскі і Менскі, а таксама і фінапарат не прынялі дастатковых мер для поўнага выяўленьня кулацкіх гаспадарак для індывідуальнага абкладаньня іх сельска-гаспадарчым падаткам. Праверка працы па індывідуальнаму абкладаньню паказала шмат прыкладаў скрыўленьня клясавай лініі як з боку раёных, так і акруговых устаноў і недаабкладаньня кулакоў. Побач з гэтым нагляддаюцца выпадкі індывідуальнага абкладаньня серадняцкіх гаспадарак. Па ўсіх акругах на 15 кастрычніка за кулацкімі гаспадаркамі застаецца значная нядоімачнасьць, прычым жорсткія меры ўжыты толькі ў адносінах часткі гэтых нядоімшчыкаў.

СНК запрапанаваў усім акруговым выканаўчым камітэтам і НКФіну безадкладна ўзмацніць працу па дадатковаму выяўленьню кулацкіх гаспадарак для індывідуальнага абкладаньня іх сельска-гаспадарчым падаткам, арганізаваць праверку падліку іх сапраўднага даходу, выправіць усе выпадкі індывідуальнага абкладаньня серадняцкіх гаспадарак, а таксама даручыць АВК праверыць фактычную працу савецкага і фінансавага апарату ў гэтай галіне і вінаватых прыцягнуць да адпаведнай адказнасьці. Ужыць жорсткія меры ў адносінах службовых асоб, якія дапусьцілі нядбайнасьць і скрыўленьне клясавай лініі ў гэтай справе.

Нядоімкі па с.-г. падатку, якія лічацца за кулацкімі гаспадаркамі, павінны быць спагнаны не пазьней 1 лістапада гэтага году, для чаго неабходна ўжыць меры прымусовага спагнаньня ў адносінах нядоімшчыкаў-кулакоў.

За недастаткова прынятыя меры для дадатковага выяўленьня кулацкіх гаспадарак і незабясьпечаньне выкананьня мінімальнага заданьня, СНК пастанавіў абвясьціць прэзыдыумам Менскага і Гомельскага акруговых выканаўчых камітэтаў вымову.

ПРА АДЗІНЫ БАНК У ВІЦЕБСКАЙ ВОПЫТНА-ПАКАЗАЛЬНАЙ АКРУЗЕ.

СНК згадзіўся з прапановаю НК РСІ пра злучэньне ў адзіны Дзяржаўны Банк аддзяленьня Дзяржаўнага Банку СССР, аддзяленьня Беларускага Банку камунальнай гаспадаркі і акруговага т-ва сельска-гаспадарчага крэдыту. Адзіны Дзяржаўны Банк у Віцебску павінен зьявіцца філіялам Дзяржаўнага Банку СССР і выконваць наступныя функцыі: кароткатэрміновыя крэдытаваньні прамысловасьці, гандлю і кааперацыі, мэтавае крэдытаваньне сельскай гаспадаркі, жыліпчнакамунальнага будаўніцтва і мясцовай прамысловасьці, касавае выкананьне мясцовага і дзяржаўнага бюджэту і г. д. Арганізацыя адзінага Банку ў Віцебску павінна быць скончана да 10 лістапада г. г.

ПРА ПЕРАВОД ПРАДПРЫЕМСТВАЎ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ НА БЕСПЕРАПЫННЫ ТЫДЗЕНЬ.

Для пераводу прадпрыемстваў прамысловасьці БССР на бесперапынны тыдзень СНК вылучыў урадавую камісію пад старшынствам Нам. Старшыні СНК БССР т. Грысевіча і членаў: Гніляхевіча—ад НКПрацы, Каплана—ад Дзяржпляну, Розіна—ад ЦСПСБ. Кізіла—ад НКГандлю, Барсукова—ад НКАх. Здароўя і Платуна—ад НКАсьветы.

Да ведама ўсіх устаноў.

Усе сродкі, сабраныя ў фонд трактарнай калёны, просьба здаваць на наступныя бягучыя рахункі: Белсельбанк № 208; Цэнтральная Ашчадная каса № 01588 і Дзяржбанк № 985.

Супроць антысавецкіх клёпаў на наш апарат.

Наш чытач памятае тыя паклёпніцкія выступленьні і трацкістаў і суханаўцаў і цэлага шэрагу рознакаляровых людзей з антысавецкімі адзнакамі, якія пэўны час пісалі пасквілі на ўсе заваёвы Кастрычніка ў галіне савецкага будаўніцтва, якія пахабна крычалі аб перараджэньні савецкага апарату, якія гаварылі аб затапленьні ніжэйшых паверхаў савецкай сыстэмы кулацкімі і нэпманскімі элемэнтамі. Гэты гістарычны лямант ня спыняецца і дагэтуль на старонках усяе замежнае жоўтае прэсы.

На гэтых днях, менавіта 17-га кастрычніка, нешта падобнае зьявілася ў фэльетоне Цім. Зарэчнага «Трэскі на хвалях» (гл. „С. Б.“ № 238). Гэты фэльетон у газэту папаў памылкова, дзякуючы недагляду кіруючага складу рэдакцыі. Рэдакцыя своечасова рэагавала на памянёны фэльетон і на другі-ж дзень дала свае заўвагі аб паклёпніцкай, няверный антысавецкай устаноўцы аўтара фэльетону „Трэскі на хвалях“.

Але прымаючы пад увагу тое, што гэтае пытаньне вельмі важнае, адзначаючы тое, што Цімох Зарэчны кінуў усяму нашаму савецкаму апарату цяжкае абвінавачаньне, лічым патрэбным яшчэ раз спыніцца на фэльетоне Цім. Зарэчнага.

Мы ня маем намеру разглядаць памянёны фэльетон з боку фармальных матываў творчасьці аўтара, мы ня думаем спыняцца на тым, што Цім. Зарэчнага напісаць яўна[...] кія радкі; ці палітычная [...]насьць, ці такая-ж палітычна[я ...]касьць, ці намеранае жаданьне [...] у друку з сваімі мякка кажуч[ы ...]гамі» да нашае савецкае ка[...]

Але мы павінны сьцвер[дзіць, што] апошнія радкі не выпадковы[я, што] праз увесь фэльетон праходзя[ць думкі] аб масе (аўтар гаворыць аб [ёй], паміж іншым, не дэфарэ[ючы] апошняга) і аб вярхох пад[...] у далейшым разумее наш [...] «папяровую дзяржаву». [...] што тут ёсьць супроцьс[таўленьне] апарату — масам і аўтар [...] сваё нездавальненьне да саве[цкага апа]рату, які па яго думцы „бю[рократыч]ны ў сваёй аснове глухі і [...] цэлай сыстэме“ і патрабуе [...] вы ўсяе сыстэмы «ад сел[ьсавету да] наркамату».

Зразумела, што ўся гэтая [...]ка зьяўляецца ня чым і[ншым, як] кулацкім пасквілям на н[аш ...] істасьць на наш дзяржаўны [апарат] які зьяўляецца апаратам д[...] пралетарыяту.

* *

Сход працаўнікоў рэдакцыі [...]даў пытаньне аб памянёных [...]ме Цім. Зарэчнага і поўнасьц[ю далу]чаецца да заўваг рэдакцыі.

ЛІСТ У РЭДАКЦЫЮ.

Далучаючыся да заўвагі рэдакцыі па майму фэльетону „Трэскі на [хвалях“ ...] фармуліроўку апошняга абзаца адносна бюракратызму савецкага апар[ату ...] сваёй грубай палітычнай памылкай.

21-X-29 г. **Цім. За[рэчны].**

ХРОНІКА.

За нядбайныя адносіны да хлебазагатовак.

Калегія Мазырскай акруговай РСІ, разгледзеўшы працу раёнаў па загатоўцы хлеба, знайшла, што загатоўка хлеба па Мазырскай акрузе праходзіць дрэнна. Асабліва дрэнна ідуць хлебазагатоўкі ў раёнах: Лельчыцкім, дзе заданьне выканана ўсяго на 18,3 процантаў, Патрыкоўскім—выканана 16,8 проц., Капаткевіцкім —17,3 процантаў і зусім у катастрафічным становішчы хлебазагатоўкі ў Азарыцкім і Тураўскім раёнах, у першым заданьне выканана на 6,4 проц. і ў другім —на 7,1 проц.

За слабае выкананьне пляну загатовак і кантрактацыі з прычыны нядбайных адносін да кантролю і кіраўніцтва ў раёне Акрсельсаюзу абвешчана суровая вымова.

Калегія знайшла, што працаўнікі Азарыцкага РВК аднесьліся да пытаньня хлебазагатовак нядбайна, на падставе чаго вінаватыя ў зрыве плянавага заданьня прыцягнуты да судовай адказнасьці.

Усяму складу прызыдыуму Тураўскага РВК за недастатковае рэагаваньне па выпраўленьні дапушчанай нядбайнасьці ў зрыве загатовак абвешчана суровая вымова з папярэджаньнем, што за не выкананьне пляну яны будуць аддадзены пад суд.

Вучот хлебазагатовак вядзецца кепска.

Адсутнічае плянавасьць у працы.

Рэспубліканскае бюро «Ару»—вучотных работнікаў накіравала ў раёны і вёскі брыгаду для абсьледваньня становішча вучоту на хлебазагатоўчых пунктах.

Як відаць з матар'ялаў праверкі, яшчэ дагэтуль адсутнічае адзінае належнае інструктаваньне бухгальтарскага апарату ў пастаноўцы працы, асабліва ў частцы хлебазагатовак.

Справаздачы, што прадстаўляюцца, як у акруговыя, так і рэспубліканскія цэнтры, надзвычайна складаныя.

Існуючы парадак афармленьня кантрактацыі зьяўляецца вельмі грамоздкім і наогул бюракратычным. У справаздачах ёсьць шмат непатрэбных граф. Рахунковы пэрсанал у большасьці сваім недастаткова кваліфікаваны.

Па лініі Белсельсаюзу адсутнічае жывы інструктаж. Яшчэ дагэтуль захоўваюцца старыя формы кніг.

Ёсьць шэраг выпадкаў няправільных разьлікаў з сялянамі за здаваемы хлеб.

На ссыпных пунктах вялікія застоі, адсутнічае [...]льны вучот, што асабліва заўважаецца ў м. Койданаве па с-г. кааперацыі «Сіла».

Рэспубліканскае бюро, азнаёміўшыся з вынікамі абсьледваньня, прызнала патрэбным абавязковага ўвядзеньня адзінай формы вучоту.

Для нагляду за існуючай формай справаводзтва ўтворана спэцыяльная брыгада з удзелам прадстаўнікоў НК Гандлю, Саюзхлебу і інш.

Рэспубліканскае бюро ўключыла ў плян сваёй працы выезды на месцы. Брыгада вучотных работнікаў, якая выехала ў раёны, выявіла ненармальных ўзаемаадносіны паміж хлебазагатоўчымі органамі Барысаўскага і Капыльскага р. у адносіне разьмеркаваньня пунктаў загатовак, а таксама ў парадку прэміраваньня здатчыкаў хлеба.

Падрыхтоўка аграномаў-калгасьнікаў.

Менскі АВК асыгнуе 10000 руб. на арганізацыю курсаў для падрыхтоўкі аграномаў-калгасьнікаў. На курсы будзе прынята 50-60 аграномаў. Праца курсаў разьлічана на паўтара-два месяцы.

Асьветнікі на ліквідацыю няпісьменнасьці.

На дапамогу саюзу с-г. і лясных рабочых ліквідаваць няпісьменнасьць вылучаюцца па ўсей Беларусі 3735 настаўнікаў, якія будуць весьці працу ў парадку грамадзкай нагрузкі.

Апрача таго, вылучана ў дапамогу саюзу народнага харчаваньня 750 настаўнікаў.

Шэфства над калгасамі.

Рэспубліканскае бюро „Ару“—рахункаводных работнікаў узяла шэфства над 3 калгасамі Беларусі. Мясцовым групам таксама даручана шэфстваваць над 10-15 калгасамі.

Шэфства мае на мэце наладзіць і дапамагчы вучоту ў калгасах.

Падрыхтоўка кваліфікаваных краўцоў.

Згодна вестак Белшвэйтрэсту, школа швэйнікаў у Менску адчыняецца 1-га лістапада. У ФЗВ будзе прынята 200 чалавек.

Для школы абсталёўваецца спэцыяльнае памяшканьне.

У школу ФЗВ швэйнікаў г. Віцебску будзе прынята 100 чалавек.

Калгасны рух у Менскай акрузе.

Водлуг вестак Менакрза, зараз у акрузе існуе 215 калгасаў на пляцы ў 37282 гэкт., што складае 2,8 проц. ад плошчы с.-г. значэньня. Да 1-га кастрычніка 1930 г. мяркуецца мець у акрузе 583 калгасы на 175000 гэкт., г. з. рост па плошчы на 500 проц., па ліку—на 2,5 проц.

Калі плян калектывізацыі будзе поўнасьцю выкананы, калгасы будуць займаць 12,7 проц. ад плошчы с.-г. значэньня.

Акруговы зьезд асьветнікаў Аршаншчыны.

Выходзячы з таго, што старшыня Аршанскага аддзяленьня саюзу працасьветы т. Шунейка фармальна і бюракратычна аднёсься да абавязкаў, ускладзеных на яго РСІ, па дасьледаваньню справы ў Аршанскай чыгуначнай 9-цігодцы ЦП саюзу знашло немагчымым застаўленьне яго на прафэсійнай працы. Перад ЦСПСБ узьнята пытаньне аб скліку ў канцы кастрычніка акруговай канфэрэнцыі асьветнікаў Аршаншчыны.

1877439 членаў аб'ядноўваюць к-ты ўзаемадапамогі.

У БССР знаходзіцца 1432 к-ты сялянскай узаемадапамогі, якія аб'ядноўваюць 735502 двары з 1877439 членамі.

КСУ маюць 347 розных прадпрыемстваў: кузьняў, млыноў, цагельняў і г. д., 757 пракатных пунктаў з 3972 машынамі, 33 злучныя пункты і 915 магазынаў.

Кошт насенных фондаў і прадпрыемстваў КСУ ацэньваецца ў 2 міл. руб.

Арганізацыя працоўных арцеляў.

З гэтага году ў сельскіх мясцовасьцях пачынаецца шырокая арганізацыя працоўных арцеляў, якія ставяць сваёй мэтай уцягваць у розныя работы на вёсцы—як лесазагатоўкі ды інш.—толькі бядняцкія серадняцкія масы. Заможная частка вёскі ня будзе дапускацца ў арцелі. Кіраваньне ўсёй працай арцеляў ускладаецца на спэцыяльных упаўнаважаных Наркампрацы.

Падрыхтоўка працаўнікоў піянэр-руху.

Пры Гомельскім, Віцебскім і Менскім пэдагагічных аддзяленьнях сёлета існуюць пазашкольныя аддзяленьні. Пазашкольныя аддзяленьні ставяць мэтай рыхтаваць пэдагогаў—працаўнікоў Бюро Ю. П., важатых фарпостаў пры сямігодках, загадчыкаў дзіцячых клюбаў, важатых піянэр-атрадаў дзіцячых дамоў. Тэрмін навучаньня ў пазашкольным аддзяленьні 4 гады. На гэтыя аддзяленьні прымаюцца выключна камсамольцы.

СУД

Атаман „Кадзін“ і яго шайка хуліганаў.

На працягу трох дзён нарсуд 2 вучастку ў г. Менску разглядаў справу 11 хуліганаў з Камароўкі, якія сваімі ўчынкамі тэрарызавалі рабочыя акраіны.

Шайка на чале з „атаманам“ Гэльманам Казімірам (клічка „Кадзін“) нападала на жыхароў, зьдзекаваліся над прахожымі, хуліганіла на вечарох у рабочых клюбах.

Аднойчы, калі міліцыянэр паспрабаваў суняць хуліганаў, яны напалі на яго, пачалі страляніну і з крыкам—„кідай зброю“—закідалі яго камяньнямі.

Пры затрыманьні хуліганаў у многіх былі знойдзены нажы і інш.

На судзе хуліганы прыкідваліся „няпрыкметнымі“—яны ў гэтым не вінаваты, ім так гаварылі...

Нарсуд прыгаварыў Гэльмана, Радзевіча і Коляпакова на 3 гады зьняволеньня кожнага з суровай ізаляцыяй. Па адбыцьці пакараньня яны будуць высланы з Менску.

Іншыя падсудныя прыгавораны на розныя тэрміны зьняволеньня.

Суд адбываўся ў паказальным парадку пры вялікай зацікаўленасьці з боку працоўных акраін.

О.

Паштовая скры[нка]

Ведаючым. Слуцкі р. Дапіс [...] будзе вучыцца чужды элемэнт“ [...]лі ў Бабруйскую акр. інспэкт[ыю] асьветы.

П. М. Ворша. Дапіс „Малая [...] адзей справы“ пераслалі ў [...] БССР.

А. Адамчуку. Пад допісам тр[эба] свой падрабязны адрас.

Уладзю-Школьнаму. Менск. [...] аб гадзінах па вайнізацыю на[...] школьнай радзе.

А. У. Койданаўскі р. Дапіс „С[...] гаспадаркі ШСМ“ пераслалі ў [...] акруговы інспэктарыят нарасьве[ты].

С. Фрыду. Вершы „Дзяльба“ [...] на наша вуліцы“ зьмясьцеце ў [...] газэце вашай камуны—у нашай [...] надрукаваны ня будуць.

П. Савасьцьянаву. П'еска—„Дз[...] і Мікола аб шматпольлі“ і верш[ы ...] лых нацеваў беларускага муж[ыка ...] друку не надыйшлі.

Банадысю. Слуцак. Дапіс „Сва[...] бліжэй да цела“ друкаваць ня [...] зьмясьціце ў сваёй насьценгазэ[це].

Прысутнаму і Асьветніку. Мазы[р]. Пішыце аб ходзе сап[...] спабо[...] род ясьветнікаў вашага раёну.

Удаламу. Заслаўскі р. Перасал[...] намасьветы.

СПРАВАЧНЫ АДДЗЕЛ.

КАТЫРОЎКА ПАЗЫК НА 24 КАСТРЫЧНІКА 1929

	Куп.	Прад.
1 6 проц. выйгр. паз.	4.97	—
Бяспроц. выйгр. паз. 26 г.	128.	130.
Выйгр. пазыка 1929 г.	100.55	100.95
10 проц. выйгр. паз. 27 г.	25.46	25.56
3-я сялянск. выйгр. паз. 27 г.	5.03	—
Дзярж. паз. узм. сял. гас.	10.41	10.76
1 выйг. паз. індустр. 27 г.	25.29	25.39
2 " " " проц.	25.[..]	
2 " " " 6-проц.	25.[..]	
11 проц. дзярж. паз. 1928 г.	101.[..]	
12 проц. рэнтн. паз. 1927 г.	104.71	
11 проц. дзярж. паз. 28 г.	101.5	
12 проц. рэнтная паз. 27 г.	104.6[.]	

Апавяшчэньні.

Камісія па чыстцы ячэйкі КП(б)Б МЭДФАКУ БДУ паведамляе, што яна распачала работу.

Першы АДКРЫТЫ сход ячэйкі, прысьвечаны чыстцы, адбудзецца 25-ГА КАСТРЫЧНІКА А 6 ГАДЗ. ЎВЕЧАРЫ Ў АКТАВАЙ ЗАЛІ БДУ.

На сход ячэйкі запрашаюцца беспартыйныя рабочыя, служачыя і навуковыя працаўнікі, зьвязаныя з работай мэдфаку, а таксама ўсе жадаючыя рабочыя, сяляне і служачыя.

Заявы, як аб рабоце ячэйкі, так і адносна асобных членаў і кандыдатаў ячэйкі прымаюцца:

У рэдакцыі газэты „Зьвязда“ (партсэктар).

У бюро ячэйкі мэдфаку (Ленінградзкая, 8), дзе выстаўлена спэцыяльная зачыненая скрынка для заяў.

КАМІСІЯ ПА ЧЫСТЦЫ ЯЧЭЙКІ КП(б)Б МЭДФАФУ БДУ.

У пятніцу 25 кастрычніка 1929 г. а 8 гадзіне ўвечары ў памяшканьні Польскага Рабочага клюбу адбудзецца сход удзельнікаў антырэлігійнага сэмінарыя для настаўнікаў польскіх школ сумесна з сябрамі агітпропгрупы пры антыкаталіцкай сэкцыі. На парадку дня [даклад ...]цыйны даклад т. т. Анджыяка [...] ваючых рэлігійных каталіцкіх „Все сьвятыя“ і „Дзень задушні“.

Прысутнасьць паймянёных пра[...]коў абавязкова і без спазьненьня.

— Для беспрацоўных сяброў Працасьветы сярэдняй і вышэйшай [кваліфікацыі] адчынены пры Доме [...] гурток па вывучэньню белмовы.

Запіс жадаючых вытвараецца ў [са]юзу Працасьветы штодзённа.

Заняткі ў гуртку пачынуцца 1-г[а ліста]пада г. г.

ПЭДГАБІНЭТ.

1) У пятніцу, 25-га кастрычні[ка] роўна ў 7 гадзін увечары перш[ы сход] сяброў сэкцыі інтэрнацыянальн[а]га выхаваньня. Яўка настаўнікі[ў, якія] запісаліся ў сэкцыю, абавязкова.

2) У пятніцу, 25-га кастрычні[ка ...] дзіне ўвечары сход сэкцыі радавс[...]лавога) выхаваньня.

Яўка настаўнікаў, якія запісаліся [у сэк]цыю, абавязкова.

Адказны рэдактар П. ШАСТ[...]

ТЭАТР-КІНО

КІНО-ТЭАТР „КУЛЬТУРА“.	З панядзелка 21 кастрычніка **„З 1-м красавіком“** амэрыканская камэдыя ў 6 частках. Звыш праграмы: культфільм у 3-х частках «ПАЛЯВАНЬНЕ НА ГАРЫЛУ».
КІНО «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ».	З панядзелка 21 кастрычніка амэрыканскі фільм **„Радыё і леў“.** Звыш праграмы: кіно-хроніка САВКІНО № 57. Пачатак а 7 гадзіне.
1-Ы ДЗІЦЯЧЫ КІНО-ТЭАТР „ЮНЫ ПІАНЭР“.	З панядзелка 21 кастрычніка **„Сэрца Азіі“** кіно-нарыс у 6 частках. Звыш праграмы: цікавая камэдыя „Янка піанэр“. Каса адчынена ад 2 гадз.
КІНО „ПРАЛЕТАРЫ“	Новы фільм вытв. „Савкіно“ **„Каін і Арцём“** драма ў 6 частках. Пачатак а 7 г. 15 хв.

СЬПЯШАЙЦЕСЯ ПАДПІСАЦЦА НА ГАЗЭТУ
„САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ“
НА ЛІСТАПАД МЕСЯЦ І ДАЛЕЙШЫЯ ТЭРМІНЫ.

Даводзіцца да ведама адпаведных устаноў, што **РАДАШКОВІЦКАЯ МЫТНІЦА** згодна загаду Наркамгандлю СССР ад 28 верасьня 1929 году за № 77 скасавана.

БЕЛ. АДДЗЯЛЕНЬНЕ Г. М. К.

ДОМ ПІСЬМЕНЬНІКА.

Сёньня 24 кастрычніка а 8 гадз. ўвечары ў Доме Пісьменьні[ка]

АДБУДЗЕЦЦА

СПАТКАНЬНЕ БЕЛАРУСКІХ ПІСЬМЕНЬНІКА[Ў]

з катэдрай мовы і літаратуры Беларускай Акадэміі Нав[ук]

Даклад аб пляне працы катэдры на 1929-30 акадэмічны год прачытае праф. І. І. ЗАМОЦІН.

Запрашаюцца ўсе пісьменьнікі, выкладчыкі мовы і літаратуры гор. Менску і іншыя зацікаўленыя асобы.

ПРАЎЛЕНЬНЕ

Нарсуд Бярэзінскага р., Менск. акр. на падставе прыгавору суду ад 21 жніўня 1929 г. і 237 арт. К. К. за нанясеньне зьнявагі славамі Аўтуховічу Сямону Захараву абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне гр. Бураму Піліпу Ананьневу селяніну в. Гарэніоы Капланецкага с.-с.

Нарсуд Бярэзінскага р., Менскай на падставе прыгавара суду ад [...] расьня 1929 г. і 213 арт. К. К. з[а ...] дачу папу корму для ската абв[яшчае] грамадзкае ганьбаваньне стар[шыні] Пагоскай малочнай арцелі Таўнач[...] колу Хвёдараву

Нарсуд г. Віцебску на падставе прысуду за 31 жніўня г.г. арт. 131 КК за самаўпраўства, абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне гр. Баланд Грэты Іванаўны, жых. у г. Віцебску па Валадарскай вул. № 51.

Нарсуд гор. Віцебску на падставе суду за 31 жніўня г.г. і арт. 131 [КК за] самаўпраўства абвяшчае грама[дзкае] ганьбаваньне гр. Фралову Пятру [...]левічу, жых. у г. Віцебску па Ба[...]кай вул. № 6.

Менскі ЗАГС выклікае гр. Сейфора Гіляля Янкелова на 21 лістапада 1929 г. па справе аб скасаваньні шлюбу з гр-кай Сейфер Сарай Шлемавай.

Менскі ЗАГС выклікае гр-на Чу[...] Паўла Нікалаевіча на 19 лістапада 1[929 г.] па справе аб скасаваньні шлю[бу з] гр-кай Чупрыс Еленай Дзьмітрые[вай].